ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 33 (1567) | Аўторак, 25 красавіка 1961 года | Цана 4 кап.

Усё шырэй разгортваецца будаўніцтва буйнейшай у рэспубліцы Бярозаўскай ДРЭС. Ідзе мантаж жалезабетоннага каркаса станцыі, установка корпуса кандэнсатара турбіны вагою ў 114 тон. Робіцца ўзбуйненая зборка блокаў праматочных катлоў. Першы блок павінен быць пушчан у чацвёртым квартале г. г. Дзесяткі перадавых брыгад будаўнікоў спаборнічаюць за ганаровае званне брыгад камуністычнай працы і перавыконваюць [illegible] нормы.

На будаўніцтве насоснай добра працуе брыгада слесараў-мантажнікаў, якой кіруе Міхаіл Шымчук.

НА ЗДЫМКУ (злева направа): брыгадзір Міхаіл ШЫМЧУК, слесар Аляксандр ШЫРАЕЎ і электразваршчык Якаў КАЧЫНА.

Фота М. Мінковіча.

ЛЕНІНІЗМ—СЦЯГ НАШАЙ ЭПОХІ

Даклад таварыша П. Н. ДЗЕМІЧАВА на ўрачыстым пасяджэнні ў Маскве, прысвечаным 91-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна

Таварышы!

Дзевяноста першую гадавіну з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна Камуністычная партыя, народы Савецкага Саюза, працоўныя ўсіх краін адзначаюць у абстаноўцы сусветна-гістарычных перамог ленінізма.

Ленінізм стаў сцягам нашай эпохі, увасобіўся ў сацыялістычную рэчаіснасць, з'ўляецца сімвалам камуністычнай будучыні ўсяго чалавецтва.

У пярэдадзень гадавіны з дня нараджэння Леніна ўвесь свет стаў сведкам новага найвялікшага подзвігу савецкага народа.

Увесь свет з захапленнем апладзіруе першаму палёту чалавека ў космас, — савецкага чалавека, грамадзяніна Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

У гэтым подзвігу адлюстраваліся магутнасць нашай Радзімы, перавага сацыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу, тытанічныя творчыя сілы савецкага народа.

Справа Леніна, ідэі Леніна трыумфуюць у перамогах разгорнутага камуністычнага будаўніцтва ў СССР, у поспехах сацыялістычных пераўтварэнняў краін народнай дэмакратыі, у магутным размаху сусветнага камуністычнага і рабочага руху, нацыянальна-вызваленчай барацьбы.

Ідэі Леніна натхняюць найшырэйшыя масы працоўных, якія ўзняліся на свяшчэнную бітву за мір, дэмакратыю і сацыялізм.

Жыццёвасць і неперможнасць ленінскіх ідэй заключаецца ў тым, што яны найбольш глыбока і поўна выражаюць карэнныя інтарэсы людзей працы, надзённыя патрабаванні сучаснай эпохі гістарычную неабходнасць рэвалюцыйнага пераходу ад капіталізму да сацыялізма і камунізма.

Камуністычная партыя Савецкага Саюза, братнія камуністычныя і рабочыя партыі нястомна развіваюць і ажыццяўляюць вялікае вучэнне марксізма-ленінізма.

Буйнымі вяхамі ў развіцці ленінізма з'явіліся XX і XXI з'езды КПСС, нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый.

Вялікі ўклад у тэорыю і практыку камунізма ўнясе маючы адбыцца XXII з'езд, які прыме новую праграму партыі — праграму пабудовы камуністычнага грамадства ў нашай краіне.

Пад ленінскім сцягам, узначальваемы ленінскай партыяй, савецкі народ упэўнена ідзе насустрач сваёй будучыні.

«Геній Леніна, — гаворыць таварыш М. С. Хрушчоў, — асвятляе наш шлях да камунізма, натхняе нас на новыя подзвігі ў імя міру і шчасця ўсяго чалавецтва!»

РАЗГОРНУТАЕ БУДАЎНІЦТВА КАМУНІЗМА Ў СССР— ЛЕНІНІЗМ У ДЗЕЯННІ

Таварышы!

Савецкім людзям выпаў вялікі гонар пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі на чале з Леніным першымі пачаць пабудову сацыялістычнага грамадства.

У выніку гераічных намаганняў рабочага класа, сялянства, інтэлігенцыі сацыялізм у нашай краіне перамог поўнасцю і канчаткова. Савецкі Саюз уступіў у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма, пракладвае шлях у светлую будучыню ўсім народам.

Чым бліжэй падыходзім мы да запаветнай мэты — камунізма, тым усё ярчэй, усё больш адчувальнай становіцца сіла ленінскага генія, што ўказаў адзіна правільны шлях, па якім перамагановна крочыць наш народ, народы ўсіх краін сацыялізма.

Яшчэ ў самым пачатку сацыялістычнага будаўніцтва Ленін з геніяльнай празорлівасцю прадбачыў імклівы рост эканомікі нашай Радзімы, росквіт яе навукі і культуры, няўхільны ўздым дабрабыту народных мас.

Ленін марыў аб тым, каб паставіць усю суму накопленых чалавецтвам ведаў на службу людзям працы.

У нашы дні ленінскія прадбачанні збываюцца і ажыццяўляюцца з надзвычайнай дакладнасцю і паўнатой.

Яскравае сведчанне таму — гіганцкі палітычны, эканамічны, навукова-тэхнічны і культурны прагрэс Савецкага Саюза.

Вянцом нашых выдатных дасягненняў ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці з'яўляецца першы ў гісторыі Зямлі палёт карабля-спадарожніка «Усход» з чалавекам на борце ў касмічную прастору.

Мы гаворым аб гэтым з асаблівай гордасцю таму, што першы чалавек, які зрабіў касмічны палёт вакол Зямлі, — наш суайчыннік, член партыі вялікага Леніна — Юрый Аляксеевіч Гагарын.

Мы гаворым аб гэтым з гордасцю таму, што першы касмічны палёт чалавека — гэта вялікая перамога розуму і працы вучоных, канструктараў, тэхнікаў, рабочых, усіх савецкіх людзей — будаўнікоў камунізма.

Зусім не выпадкова, што першымі здолелі пранікнуць у космас іменна савецкія людзі.

Гэта — заканамерны вынік паспяховага ажыццяўлення грандыёзнай праграмы камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, нястомных клопатаў партыі аб развіцці эканомікі і навукі, тэхнікі і культуры, аб дабрабыце нашага народа.

Толькі на шляхах сацыялізма і камунізма можа быць дасягнуты сапраўдны прагрэс чалавецтва.

Мы жывём у перыяд найвялікшага росквіту навукі і тэхнікі, звязанага з комплекснай механізацыяй і аўтаматызацыяй вытворчасці, з выкарыстаннем атамнай энергіі, сінтэтычных матэрыялаў, з шырокім ужываннем радыёэлектронікі і тэлемеханікі.

У радзе рашаючых галін навукі і тэхнікі наша краіна ўжо трывала займае першае месца ў свеце.

З незвычайнай сілай пацвярджаюцца прарочыя словы Леніна, што сацыялізм вызваліць навуку ад скоўваючых яе буржуазных путаў і адкрые перад ёю перспектывы бязмежнага развіцця. Паслядоўнае ажыццяўленне ленінскай палітыкі індустрыялізацыі і электрыфікацыі ператварыла нашу краіну ў магутную індустрыяльную дзяржаву.

За гады Савецкай улады валавая прадукцыя прамысловасці павялічылася ў 45 разоў.

Савецкі Саюз у цяперашні час выпускае прамысловай прадукцыі больш, чым такія буйныя краіны Еўропы, як Англія, Францыя і Заходняя Германія, разам узятыя.

У выніку самаадданай працы савецкіх людзей, шырокага выкарыстання навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі СССР абагнаў галоўныя капіталістычныя краіны Еўропы па ўзроўню прадукцыйнасці працы ў прамысловасці.

У нашай краіне сапраўды ўсенароднай стала барацьба за тэхнічны прагрэс, з велізарнай сілай б'юць крыніцы творчай ініцыятывы. Аб гэтым гавораць, напрыклад, такія лічбы: за два гады сямігодкі ўкаранёна 4 мільёны 600 тысяч рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў з эканамічным эфектам каля двух мільярдаў шасцісот мільёнаў рублёў.

Характэрна, што, побач з вучонымі, інжынерамі і тэхнікамі, у вырашэнні самых складаных тэхнічных пытанняў удзельнічаюць рабочыя.

За гады Савецкай улады культурна-тэхнічны ўзровень працоўных нязмерна ўзрос.

Калі ў царскай Расіі сярод рабочых не было людзей з сярэдняй і тым больш з вышэйшай адукацыяй, то цяпер 39 працэнтаў савецкіх рабочых маюць сярэднюю і вышэйшую адукацыю.

Гэта адлюстроўвае працэс паспяховага пераадолення істотных адрозненняў паміж разумовай і фізічнай працай.

Важнейшым этапам на шляху стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма з'яўляецца выкананне сямігадовага плана.

Вынікі двух год сямігодкі даюць падставы заявіць, што яе заданні будуць не толькі выкананы, але і перавыкананы.

Як вядома, па сямігадоваму плану меркавалася павялічыць выпуск прамысловай прадукцыі за два гады на 17 працэнтаў, фактычна ж ён узрос на 22,1 працэнта.

Наперакор прароцтвам буржуазных эканамістаў, Савецкі Саюз захоўвае высокія тэмпы свайго развіцця.

За апошнія 7 год прырост прамысловай вытворчасці ў Савецкім Саюзе складаў у сярэднім 11,1 працэнта ў год, у той час як у ЗША — усяго 2,5 працэнта. Гэта азначае, што савецкая прамысловасць развіваецца ў 4—5 разоў хутчэй, чым амерыканская.

З вялікім творчым уздымам працуюць савецкія людзі ў трэцім годзе сямігодкі.

Нагляднае таму сведчанне — перавыкананне плана першага квартала 1961 года. План выпуску валавой прадукцыі прамысловасці за гэты перыяд выканан на 102,5 працэнта. У параўнанні з першым кварталам мінулага года выпуск прамысловай прадукцыі ўзрос амаль на 9 працэнтаў.

У кіруючых колах ЗША не могуць утаіць трывогі адносна нашых эканамічных поспехаў і, у прыватнасці, адносна таго, што ў апошнія месяцы ў СССР выплаўляецца сталі прыкладна столькі ж, колькі ў Злучаных Штатах.

Усе савецкія людзі радуюцца таму, што наша эканоміка, развіваючыся па законах расшыранага ўзнаўлення, на строга навуковай планавай аснове, — імкліва ідзе наперад.

Праз некалькі год ужо Савецкі Саюз стане першай прамысловай дзяржавай свету, а прыкладна ў 1970 годзе пераўзыдзе найбольш развітыя капіталістычныя краіны і па выпуску прадукцыі на душу насельніцтва.

Наша партыя пры распрацоўцы планаў развіцця савецкай эканомікі заўсёды зыходзіла з асноўных палажэнняў марксісцка-ленінскай тэорыі. Тым больш цяпер, калі барацьба за стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма ўступае ў рашаючую фазу, асабліва важны навукова абгрунтаваны падыход да развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі.

Выдатнае значэнне для паспяховага камуністычнага будаўніцтва маюць пастанова студзеньскага Пленума ЦК, выступленні Мікіты Сяргеевіча Хрушчова на Пленуме і занальных нарадах перадавікоў сельскай гаспадаркі.

Уся работа Пленума з'яўляецца выдатным прыкладам ленінскага стылю кіраўніцтва, для якога характэрны творчы падыход да справы, шырокі размах і ініцыятыва, партыйная прынцыповасць, сувязь з масамі, вывучэнне і абагульненне іх вопыту.

Адзначыўшы дасягнутыя поспехі, студзеньскі Пленум у той жа час ускрыў сур'ёзныя недахопы ў сельскай гаспадарцы, абгрунтаваў неабходнасць і рэальную магчымасць больш хуткага яе развіцця, вызначыў баявую праграму вырашэння гэтай задачы.

Як вядома, пасля верасньскага Пленума ЦК наша сельская гаспадарка дабілася буйных поспехаў: на 46 мільёнаў гектараў павялічыліся пасяўныя плошчы, на 3 мільярды пудоў узрасла вытворчасць збожжа, намнога павялічылася і вытворчасць мяса, малака, бульбы, гародніны і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў.

Аднак сельская гаспадарка пакуль яшчэ адстае ад хуткага росту сацыялістычнай прамысловасці, а таксама ад узрастаючага попыту насельніцтва.

Добра вядома, што цяжкая індустрыя з'яўляецца вядучай галіной народнай гаспадаркі, яе пераважнае развіццё застаецца і ў далейшым генеральнай лініяй нашай партыі.

У той жа час партыя настойліва дабіваецца, каб усе галіны народнай гаспадаркі развіваліся высокімі тэмпамі і забяспечваўся агульны няспынны ўздым сацыялістычнай эканомікі.

Цяпер, калі наша краіна мае магутную індустрыю і несакрушальную абарону, можна не на шкоду ім выдзяляць усё больш сродкаў на развіццё сельскай гаспадаркі і лёгкай прамысловасці з мэтай поўнага задавальнення ўзрастаючага попыту насельніцтва.

Важнейшай умовай развіцця сельскай гаспадаркі, як і іншых галін сацыялістычнай вытворчасці, з'яўляецца паслядоўнае захаванне ленінскага прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленасці, правільнае спалучэнне матэрыяльных і маральных стымулаў да працы.

Сацыялістычны прынцып «ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па працы» захоўвае сваю сілу і ў перыяд разгорнутага камуністычнага будаўніцтва.

Ён служыць магутным рычагом уздыму грамадскай вытворчасці, сродкам выхавання працоўных у духу клопатаў аб інтарэсах дзяржавы, выпрацоўкі ў людзей прывычкі да працы як першай жыццёвай патрэбнасці.

Нам неабходна і ў далейшым павышаць ролю матэрыяльнай зацікаўленасці, але разам з тым трэба больш актыўна развіваць маральныя стымулы і ўзмацняць ідэйна-палітычную работу, выхоўваючы ў народа камуністычныя адносіны да працы.

Партыя шырока разгарнула арганізатарскую работу па ажыццяўленню рашэнняў студзеньскага Пленума.

Павялічваюцца капіталаўкладанні ў сельскую гаспадарку і ў тыя галіны прамысловасці, якія забяспечваюць яе тэхнікай і хімікатамі.

У вялікіх маштабах разгортваюцца работы па электрыфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Узмацняецца дапамога горада вёсцы ў механізацыі працаёмкіх працэсаў, у павышэнні культуры вёскі.

Ажыццяўляецца рэарганізацыя Міністэрства сельскай гаспадаркі, якая мае мэтай ператварыць сельскагаспадарчыя органы ў цэнтры па ўкараненню ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту.

Уводзіцца новая сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў, а таксама новы парадак продажу калгасам і саўгасам машын, мінеральных угнаенняў і іншых матэрыяльна-тэхнічных сродкаў.

Гэтыя новыя арганізацыйныя формы дазволяць паўней выкарыстаць перавагі калгасна-саўгаснай вытворчасці, забяспечыць кваліфікаванае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, яшчэ больш шырокі і непасрэдны ўдзел мас у кіраванні вытворчасцю.

Няўхільна выконваючы запаветы Леніна, партыя асаблівую ўвагу ўдзяляе выхаванню кадраў. Яна патрабуе ад іх умення працаваць з масамі, вучыцца ў іх.

Побач з тэарэтычнай і палітычнай падрыхтоўкай кіраўнікі ўсіх катэгорый павінны добра ведаць галіну, у якой працуюць, новую тэхніку і тэхналогію, перадавы вопыт. Але не толькі ведаць, а і настойліва ўкараняць усё прагрэсіўнае ў народную гаспадарку.

Вядома, якую вялікую ўвагу ўдзяляе партыя вывучэнню і абагульненню перадавога мясцовага вопыту, творчасці саміх мас.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Усенародныя ўрачыстасці

Масква

Савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва ўрачыста адзначылі вялікую дату—дзень нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Кумачовымі флагамі з раніцы запунсавела сталіца. У Вялікім тэатры Саюза ССР, дзе не раз гучалі натхнёныя прамовы Уладзіміра Ільіча, адбылося ўрачыстае пасяджэнне партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый горада Масквы, прысвечанае 91-й гадавіне з дня нараджэння вялікага арганізатара і правадыра Камуністычнай партыі, заснавальніка Савецкай дзяржавы, любімага настаўніка і друга працоўных усяго свету У. І. Леніна.

У глыбіні сцэны — велізарны партрэт Ільіча. А над ёй яркі заклік: «Няхай жыве ўсеперамагаючы сцяг ленінізма!» Золатам агнёў свецяцца даты: «1870—1961».

У прэзідыуме з'яўляюцца таварышы Л. І. Брэжнеў, М. Р. Ігнатаў, А. М. Касыгін, Н. А. Мухітдзінаў, М. А. Суслаў, К. А. Фурцава, М. М. Шверпік, П. М. Паспелаў, Д. С. Каротчанка, Г. І. Варанаў, член Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР К. Я. Варашылаў. Разам з імі — старэйшыя члены партыі. Бурнымі апладысментамі вітаюць прысутныя кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада і іншых членаў Прэзідыума.

Урачыстае пасяджэнне адкрывае член Прэзідыума ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС М. А. Суслаў.

З дакладам выступіў першы сакратар МГК КПСС П. Н. Дземічаў.

З вялікім натхненнем прысутныя спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал».

Пасля ўрачыстага пасяджэння для яго ўдзельнікаў быў дадзены канцэрт.

(ТАСС).

Мінск

Беларускі дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета. Глядзельную залу тэатра 22 красавіка запоўнілі рабочыя і служачыя прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў горада, партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія работнікі, дзеячы навукі і культуры, студэнцкая моладзь. У глыбіні сцэны на фоне флагаў саюзных рэспублік — скульптура Уладзіміра Ільіча Леніна. Зіхацяць даты «1870—1961». Ля баявых сцягаў ганаровая варта воінаў Савецкай Арміі.

17 гадзін. За сталом прэзідыума месцы займаюць кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ К. Т. Мазураў, Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлоў, сакратары ЦК КПБ Ф. А. Сурганаў, П. М. Машэраў, В. Ф. Шаура, Д. Ф. Філімонаў, старшыня Беларускага рэспубліканскага Савета прафсаюзаў І. М. Макараў, першы сакратар Мінскага абкома КПБ С. О. Прытыцкі, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР У. Г. Каменскі, намеснік камандуючага войскамі БВА А. С. Бурдзейны, старшыня Саўнаргаса БССР А. М. Тарасаў, сакратар Мінскага гаркома КПБ А. Б. Насілоўскі, старшыня выканкома Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных В. І. Шарапаў, стары бальшавік В. Я. Сядых, наладчыца трактарнага завода, Герой Сацыялістычнай Працы Р. К. Прусава, шліфоўшчык завода запасных частак С. Т. Сцепанец, муляр, Герой Сацыялістычнай Працы М. К. Макарэвіч і іншыя.

Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 91-й гадавіне з дня нараджэння вялікага правадыра і заснавальніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна, адкрывае сакратар Мінскага гаркома КПБ А. Б. Насілоўскі.

Аркестр выконвае Гімны Савецкага Саюза і Беларускай ССР.

З дакладам аб 91-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна выступіў сакратар ЦК КПБ Д. Ф. Філімонаў.

Даклад закончан. Усе ўстаюць і спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал».

У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт.

* * *

Урачыстыя пасяджэнні, прысвечаныя 91-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, адбыліся таксама ў Віцебску, Брэсце, Гродна, Магілёве, Гомелі і іншых гарадах Беларускай ССР.

(БЕЛТА).

НА ГАЛОЎНЫМ ШЛЯХУ

Штогадовае прысуджэнне Ленінскіх прэмій за самыя лепшыя творы літаратуры і мастацтва — з'ява знамянальная ў многіх адносінах. І перш за ўсё гэта — яскравае сведчанне чулых клопатаў партыі і ўрада аб развіцці савецкай культуры, аб памнажэнні духоўных багаццяў нашага народа — будаўніка камунізма. Заўтрашні дзень савецкага грамадства бачыцца нам не толькі як царства небывалай тэхнічнай узброенасці, высокапрадукцыйнай працы, поўнага матэрыяльнага дастатку. Ва ўсёй велічы павінны раскрыцца высокія маральныя якасці свабоднага чалавека, яго талент стваральніка ўсяго прыгожага на зямлі. «Чалавек па прыродзе сваёй мастак», — гаварыў А. М. Горкі. Адна з характэрных гуманістычных рысаў нашага ладу ў тым і заключаецца, што ён планамерна, мэтанакіравана стварае такія ўмовы, у якіх жыццё і праца ўсіх людзей будуць радаснай творчасцю.

За савецкай літаратурай і мастацтвам трывала замацавалася пачэсная роля прадвеснікаў камуністычнай маралі. Вялікая сіла мастацкага вобраза, выпрацаваная ў стагоддзях, памножылася ў сацыялістычным рэалізме на сілу самых перадавых ідэй нашага часу. І таму партыя ўскладае на савецкіх пісьменнікаў і дзеячоў мастацтва вялікія надзеі ў справе фарміравання духоўнага аблічча нашага сучасніка і нашых нашчадкаў.

Развіваючыся ў атмасферы высокай патрабавальнасці з боку партыі і ўсяго народа, савецкая літаратура і мастацтва кожны год узбагачаюць свой залаты фонд творчымі здабыткамі, якія займаюць пачэснае месца ў сусветнай культуры. І тут таксама, як у развіцці навукі і тэхнікі, наша краіна ідзе ў авангардзе, пракладаючы шляхі ў заўтрашні дзень. Невыпадкова сумленныя і сапраўды таленавітыя мастакі капіталістычных краін усё больш уважліва і даверліва прыглядаюцца да творчасці савецкіх майстроў і ў радзе выпадкаў адкрыта прызнаюць перавагі нашага творчага метаду.

А перавагі гэтыя зыходзяць, коратка кажучы, з таго, што сацыялістычны рэалізм узбройвае талент рэвалюцыйным разуменнем жыцця, разуменнем сапраўдных інтарэсаў і запатрабаванняў народа, дапамагае бачыць героя нашага часу і праўдзіва паказваць яго інтэлектуальны свет. Пранізаны духам наватарства, ён, аднак, сцвярджае пошукі новага не інакш як на глебе рэалістычных традыцый, і ў гэтым яго вялікія магчымасці глыбокага асэнсавання рэчаіснасці.

Прыгледзімся да твораў, удастоеных Ленінскіх прэмій сёлета. Кожны з іх — плён яркай індывідуальнасці мастака. Не будзем гаварыць пра відавую і жанравую разнастайнасць, што само сабой зразумела. Звернем увагу на ідэйна-тэматычную арыгінальнасць і выразную адметнасць выяўленчых сродкаў у межах аднаго віду мастацтва ці жанра. Паэты Аляксандр Твардоўскі і Аляксандр Пракоф'еў. Празаікі Міхайла Стэльмах і Юхан Смуул. Мастакі Б. Пракораў і М. Сар'ян. Якія гэта ў кожным асобным выпадку своеасаблівыя таленты! Непаўторнае творчае аблічча вылучае сярод майстроў музычна-выканаўчай дзейнасці выдатнага піяніста С. Рыхтэра, у дырыжорскім мастацтве — Я. Мравінскага, у тэатральным — В. Пашэнную. А якімі свежымі фарбамі заіграла даволі «асвоеная» ўжо тэма Вялікай Айчыннай вайны, калі да яе дакрануліся малады кінарэжысёр Р. Чухрай і драматург В. Яжоў!

Творы, узнагароджаныя прэміяй імя вялікага правадыра, могуць служыць пераканаўчым абвяржэннем бязглуздых абвінавачванняў савецкіх пісьменнікаў і мастакоў у аднастайнасці. Мастацтва сацыялістычнага рэалізму не ведае нівеліроўкі. Калі ж хто-небудзь па непаразуменню ці па злоснаму намеру называе нівеліроўкай ідэйна-эстэтычнае адзінства нашага мастацтва, то гэта не што іншае, як ракавая памылка. Згуртаванне мастацкіх талентаў нашай краіны на пазіцыях марксісцка-ленінскай эстэтыкі — з'ява гістарычнага значэння, поўны сэнс якой яшчэ раскрыецца. Вялікі майстар слова А. М. Горкі глядзеў далёка ўперад, калі, ацэньваючы работу Першага з'езду савецкіх пісьменнікаў, падкрэсліў, што самым важным яе вынікам ён лічыць перамогу на з'ездзе ідэй бальшэвізма.

Ленінскія ідэі, яго погляды на задачы і сутнасць мастацтва новай эпохі жывяць творчасць савецкіх літаратараў і мастакоў, паказваюць ім шлях найбольш дзейснага служэння народу. На гэтым шляху, шляху палымянай партыйнасці і народнасці, рэалізму і сапраўднага, а не ўяўнага наватарства, наша літаратура і мастацтва заваёўвала і будзе заваёўваць поспех за поспехам.

Партыя скіроўвае ўвагу пісьменнікаў і дзеячоў мастацтва на адлюстраванне глыбінных працэсаў народнага жыцця, заклікае іх узнімаць у сваіх творах важнейшыя грамадскія праблемы. І мы з задавальненнем бачым у спісу новых лаўрэатаў Ленінскіх прэмій імя Аляксандра Твардоўскага—мастака-мысліцеля, паэта вялікай тэмы, уся творчасць якога прасякнута пафасам пераможнага руху нашай краіны да камунізма. Цудоўная паэма «За даллю—даль», якой паэт аддаў дзесяць год плённай працы,—усхваляванае, поўнае сапраўднага драматызму мастацкае слова пра самае галоўнае ў сучасным жыцці савецкага народа.

Эпічны размах, асэнсаванне лёсу чалавека ў непарыўнай сувязі з грамадска-сацыяльнымі пераўтварэннямі вызначаюць прозу Міхайлы Стэльмаха. У раманах «Хлеб і соль», «Кроў людская—не вадзіца», «Вялікая радня» пісьменнік прасочвае шлях украінскага сялянства на працягу паўстагоддзя, спыняючыся найперш на важнейшых паваротах гісторыі, калі ў рашучых класавых бітвах нараджалася і мацнела сацыялістычнае грамадства.

Гераіка працы ў імя Радзімы, маральная прыгажосць душы сучасніка, радасць і шчасце быць сведкам і ўдзельнікам гістарычных здзяйсненняў савецкага народа, любоў да ўсяго, што ўзвялічвае чалавека,—гэтыя матывы даюць шырокія крылы светлай, самабытнай паэзіі Аляксандра Пракоф'ева, якая моцнымі карэннямі ўрастае ў фальклорную стыхію. Ды ўрэшце творчасць кожнага з тых, каго мы віншуем сёння з узнагародай, служыць узорам глыбокага пранікнення ў справы і думы народа і пераканаўча сцвярджае, што яркае мастацтва заўсёды жывіцца высокімі ідэаламі.

Пастанова Камітэта па Ленінскіх прэміях—вынік шырокага грамадскага абмеркавання прадстаўленых да ўзнагароды твораў. Дыскусія, у якой прынялі ўдзел тысячы рабочых, служачых, калгаснікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі, воінаў Савецкай Арміі, садзейнічала найбольш аб'ектыўнай ацэнцы працы літаратараў і мастакоў. Характэрна, што яна пайшла значна далей канкрэтнай мэты. Вялася прынцыповая гаворка аб павышэнні ролі літаратуры і мастацтва ў жыцці савецкага народа. І зусім заканамерна ў цэнтры ўвагі сталі пытанні мастацкага майстэрства. Вельмі ўжо многа ў нас з'яўляецца твораў з сур'ёзнымі прэтэнзіямі на актуальнасць, шырокі ахоп жыццёвага матэрыялу, вострую праблемнасць, аднак са слабымі адзнакамі мастацкасці. Арыентацыя на высокія мастацкія крытэрыі павінна стаць законам творчасці кожнага, хто бярэ на сябе адказнасць удзельнічаць у задавальненні і выхаванні эстэтычных густаў народа.

Прысуджэнне прэмій імя вялікага Леніна групе лепшых майстроў натхняе і абавязвае шматлікую армію савецкіх літаратараў і мастакоў. Няма сумнення ў тым, што заўтрашні дзень нашай многанацыянальнай культуры будзе адзначан новымі выдатнымі дасягненнямі.

Новы атрад лаўрэатаў Ленінскіх прэмій

Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пастанавіў прысудзіць Ленінскія прэміі 1961 года за найбольш выдатныя дасягненні ў галіне літаратуры, журналістыкі і публіцыстыкі і мастацтва:

У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ:

1. **ПРАКОФ'ЕВУ Аляксандру Андрэевічу — за кнігу вершаў «Запрашэнне да падарожжа».**
2. **СТЭЛЬМАХУ Міхайлу Афанасьевічу — за трылогію: «Хлеб і соль» —раман, «Кроў людская — не вадзіца» — раман, «Вялікая радня» — раман.**
3. **ТВАРДОЎСКАМУ Аляксандру Трыфанавічу — за паэму «За даллю — даль».**

У ГАЛІНЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ І ПУБЛІЦЫСТЫКІ:

1. **СМУУЛУ Іаханесу Юр'евічу — за антарктычны дарожны дзённік «Лёдавая кніга».**

У ГАЛІНЕ МАСТАЦТВА:

1. **МРАВІНСКАМУ Яўгену Аляксандравічу — за канцэртна-выканаўчую дзейнасць.**
2. **ПАШЭННАЙ Веры Мікалаеўне — за выкананне роляў Васы Жалязновай і старой гаспадыні Ніскавуоры ў спектаклях «Васа Жалязнова» і «Каменнае гняздо» ў Дзяржаўным акадэмічным Малым тэатры.**
3. **ПРАРОКАВУ Барысу Іванавічу — за серыю малюнкаў «Гэта не павінна паўтарыцца».**
4. **РЫХТЭРУ Святаславу Тэафілавічу — за канцэртна-выканаўчую дзейнасць.**
5. **САР'ЯНУ Марцірасу Сяргеевічу — за цыкл карцін «Мая Радзіма», «Арменія», «Калгас сяла Карыдж у гарах Туманяна», «Збор бавоўны ў Араратскай даліне», «Лалвар», «Араратская даліна з Дзвіна», «Арарат з Дзвіна», «Бюракан».**
6. **ЧУХРАЮ Рыгору Навумавічу, рэжысёру і аўтару сцэнарыя, ЯЖОВУ Валянціну Іванавічу, аўтару сцэнарыя—за мастацкі фільм «Балада пра салдата».**

З кінакамерай па рэспубліцы

Нядаўна ў сталіцы Беларусі пабывала ўрадавая гандлёвая дэлегацыя Кітайскай Народнай Рэспублікі. Знаходжанне кітайскай дэлегацыі ў Мінску ператварылася ў дэманстрацыю сардэчнай дружбы братніх народаў.

Аб усім гэтым і расказана ў першым сюжэце кіначасопіса «Савецкая Беларусь» № 10, які пачаў дэманстравацца на экранах рэспублікі.

З кінасюжэта «Добрая справа» гледачы даведаюцца аб таварыскай дапамозе, якую аказвае ў Гомельскім раёне калгас «Перамога» суседняй сельгасарцелі «Шлях да камунізма».

Вынаходнікам і рацыяналізатарам Беларускага аўтазавода ў Жодзіна прысвечан трэці сюжэт кіначасопіса — «Паскоранымі тэмпамі».

Асобныя кінакадры расказваюць аб тым, што на Тураўскім участку Прыпяці штодзённа сплаўляецца да пяці тысяч кубаметраў драўніны.

Аб новай установцы, сканструяванай работнікамі шклозавода для апрацоўкі шкла ультрагукам, апавядае кінарэпартаж, зняты аператарамі А. Забалоцкім і М. Бэравым. З цікавасцю будуць прагледжаны кінакадры аб тым, што Бабруйскі завод нестандартнага абсталявання пачаў выпуск перасоўных дач на колах, якія будуць здавацца ў пракат для індывідуальнага карыстання. Дачы добра абсталяваны, іх можна будзе ставіць у любым маляўнічым кутку.

У заключэнне кіначасопіса гледачы пазнаёмяцца з новай праграмай Мінскага цырка, праслухаюць мексіканскую народную песню «Жыццё цудоўна!» у выкананні трыо Лос Мехіканас.

ЛЕНІНІЗМ—СЦЯГ НАШАЙ ЭПОХІ

Даклад таварыша П. Н. ДЗЕМІЧАВА на ўрачыстым пасяджэнні ў Маскве, прысвечаным 91-й гадавіне з дня нараджэння Ул. І. Леніна

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Яшчэ ў першыя гады Савецкай улады Уладзімір Ільіч Ленін гаварыў: «Пабольш разнастайнасці ў практычным вопыце і пабольш вывучэння яго. Бываюць умовы, калі ўзорная пастаноўка мясцовай работы, нават у самым невялікім маштабе, мае больш важнае дзяржаўнае значэнне, чым многія галіны цэнтральнай дзяржаўнай работы». (Творы, том 32, стар. 333).

Працягваючы і развіваючы гэтую ленінскую традыцыю, Цэнтральны Камітэт нашай партыі, асабіста Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў усебакова вывучаюць і абагульняюць вопыт мас. Глыбокае веданне жыцця, новых з'яў, народжаных народнай ініцыятывай, дазваляе партыі ставіць і вырашаць новыя вялікія праблемы камуністычнага будаўніцтва.

Партыя ўзнімае на ўзровень дзяржаўнай важнасці справу укаранення дасягненняў навукі і перадавога вопыту ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Рух пад лозунгам: «Вопыт перадавікоў—здабытак усіх!» — становіцца сапраўды ўсенародным.

У нас акружаюцца увагай людзі, якія сваёй працай апярэджваюць час, дабіваюцца выдатных поспехаў.

Рашэнні студзеньскага Пленума ЦК, шчырая дзелавая размова на Пленуме і на занальных нарадах, у рабоце якіх прымаў удзел Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, надалі новыя сілы і энергію работнікам сельскай гаспадаркі.

Савецкія людзі практычнымі справамі адказваюць на рашэнні Пленума.

Па ўсёй краіне разгарнулася барацьба за рэзкае павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў з тым, каб давесці закупку збожжа штогод да 4 мільярдаў 200 мільёнаў пудоў; мяса—да 13 мільёнаў тон, малака — да 50 мільёнаў тон; у бліжэйшыя гады асвоіць яшчэ восем мільёнаў гектараў цалінных і абложных зямель.

Уся дзейнасць Камуністычнай партыі прысвечана дабрабыту і шчасцю савецкага чалавека.

Па меры таго, як растуць нашы матэрыяльныя магчымасці, партыя з яшчэ большай настойлівасцю выстаўляе задачу няспыннага папаўнення чашы народнага дабрабыту.

Раскрываючы сутнасць камуністычнага будаўніцтва, палітыкі нашай партыі, Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў гаворыць: «Камунізм, калі сказаць проста і ясна, — гэта лепшае жыццё для працоўных, для кожнага чалавека... Для таго, каб усе працоўныя маглі жыць добра, трэба мець у дастатку прадукты харчавання, адзенне, абутак, жыллё, усё неабходнае для задавальнення культурных запатрабаванняў людзей — кнігі, тэатры, кіно. Таму і прамысловасць, і сельская гаспадарка павінны развівацца ў нас высокімі тэмпамі, ісці ў нагу».

Няўхільна расце дабрабыт савецкіх людзей. Побач з ростам даходаў, якія атрымліваюць працоўныя ў якасці аплаты працы, растуць грамадскія фонды спажывання.

Бясплатная адукацыя і ахова здароўя, скарачэнне рабочага дня, пенсійнае забеспячэнне, паступовая адмена ўсіх падаткаў, небывалы размах жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва — усё гэта стала для нас прывычным і ў той жа час здзіўляе ўяўленне працоўных капіталістычнага свету.

Недалёкі той час, калі ў Савецкім Саюзе будзе самы высокі ўзровень жыцця, калі мы зможам сказаць усяму свету: «Глядзіце, вось што такое камунізм, які ўвайшоў у жыццё чалавека!»

У свядомасці соцень і соцень мільёнаў людзей усіх кантынентаў паняцці «сацыялізм», «марксізм-ленінізм» усё больш трывала асацыіруюцца з каласальным эканамічным і сацыяльным прагрэсам, з росквітам навукі і культуры, шчаслівым і забяспечаным жыццём працоўных, з трывалым мірам і дружбай паміж народамі.

Збылося геніяльнае прадбачанне Леніна аб тым, што сацыялізм будзе аказваць велізарнае і ўсё ўзрастаючае ўздзеянне на ход сусветнага развіцця.

Імперыялісты як агню баяцца праўды аб нашай рэчаіснасці, імкнуцца аблытаць хлуснёй свядомасць працоўных капіталістычных краін. Але праўду—не ўтаіць!

Праўда ў тым, што вызвалены народ, пажынаючы плён сацыялістычных пераўтварэнняў, развівае сваю эканоміку, навуку і культуру такімі тэмпамі, аб якіх капіталістычныя краіны не адважваюцца і марыць.

Праўда ў тым, што чалавек сацыялістычнага грамадства з'яўляецца сапраўды свабодным. Упершыню ў гісторыі створаны бязмежныя магчымасці для развіцця талентаў людзей, іх здольнасцей. Геній свабоднага чалавека раскрывае і ставіць на службу народа сілы прыроды, тайны атама, пракладвае шляхі ў космас.

Праўда і ў тым, што ва ўмовах сацыялізма ўпершыню ў гісторыі працоўныя выступаюць не толькі як армія працы, якая стварае матэрыяльныя каштоўнасці, але і як адзіны паўнаўладны ўладальнік гэтых каштоўнасцей, як правячая сіла, гаспадар сваёй краіны, свайго жыцця, свайго лёсу.

Як і прадбачыў Ленін, гісторыю ствараюць цяпер самастойна мільёны і дзесяткі мільёнаў людзей.

Адбываецца небывала бурны рост актыўнасці і самадзейнасці савецкіх людзей, узрастае роля грамадскіх арганізацый у гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

У гэтым знаходзіць сваё нагляднае выражэнне працэс паступовага перарастання сацыялістычнай дзяржаўнасці ў камуністычнае грамадскае самакіраванне.

Кіруючыся запаветамі свайго вялікага заснавальніка і правадыра, наша партыя ўдзяляе вялікую ўвагу камуністычнаму выхаванню працоўных, фарміраванню новага чалавека.

Яна настойліва змагаецца за павышэнне дзейснасці і ўзмацненне размаху ідэалагічнай работы, за ўмацаванне яе сувязі з практыкай камуністычнага будаўніцтва, з жыццём народа.

Ленін указваў, што ў цэнтры ўсёй работы па перарабоцы свядомасці і нораваў людзей павінна стаяць іх выхаванне ў працы, выпрацоўка новай, камуністычнай маралі, у аснове якой ляжыць барацьба за ўмацаванне і завяршэнне будаўніцтва камунізма.

Ленін раскрыў велізарнае значэнне сацыялістычнага спаборніцтва, у ходзе якога нараджаюцца, развіваюцца і перамагаюць парасткі камунізма, рысы камуністычнай будучыні.

У руху за камуністычную працу ўдзельнічаюць ужо звыш дзесяці мільёнаў чалавек, баявым дэвізам якіх стала: вучыцца, працаваць і жыць па-камуністычнаму.

Усенароднае сацыялістычнае спаборніцтва, узбагачанае новымі формамі, параджае масавы гераізм, тысячы і мільёны герояў працы.

Буржуазным абывацелям не зразумець парыву савецкіх юнакоў і дзяўчат, якія едуць з гарадоў, ад прывычнай работы—у неабжытыя раёны цаліны, на будоўлі Сібіры і Усходу.

Не голад і галеча гоняць іх, а іх кліча на слаўныя подзвігі патрыятычнае пачуццё абавязку перад Радзімай.

Ці гэта не найвялікшая заваёва нашай партыі ў выхаванні савецкага чалавека!

Адзіным, як маналіт, цесна згуртаваным вакол партыі і яе Цэнтральнага Камітэта ідзе савецкі народ насустрач XXII з'езду. Ён намячае новыя рубяжы, знаходзіць нявыкарыстаныя рэзервы, узмацняе барацьбу за датэрміновае выкананне сямігадовага плана.

Усё ярчэй разгараецца ўсенароднае перадз'ездаўскае спаборніцтва.

Сярод першых, хто ўзняў сцяг сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар XXII з'езда партыі, былі і масквічы.

Машынабудаўнікі і тэкстыльшчыкі, металургі і хімікі, транспартнікі і будаўнікі, вучоныя і канструктары—уся працоўная Масква стала на ганаровую перадз'ездаўскую вахту.

Сёння, у гадавіну нараджэння Леніна, з гэтай высокай трыбуны можна далажыць: свае абавязацельствы ў трэцім годзе сямігодкі працоўныя сталіцы выконваюць з гонарам. Заданні першага квартала 1961 г. маскоўскай прамысловасцю выкананы датэрмінова.

Стрымалі слова і будаўнікі: яны здалі 700 тысяч квадратных метраў жылля, новыя школы, бальніцы, яслі, магазіны.

На нашых вачах пераўтвараецца і прыгажэе Масква. Ніколі яшчэ яна не ведала такога грандыёзнага размаху будаўніцтва і добраўпарадкавання.

Цяпер у сталіцы будуецца штогод у дзесяць разоў больш жылой плошчы, чым у 1948 годзе. Вырастаюць новыя кварталы, магістралі, цэлыя раёны.

З пачуццём глыбокай удзячнасці сустрэлі савецкія людзі рашэнне партыі і ўрада аб стварэнні Вялікай Масквы.

І масквічы добра разумеюць, што ім трэба яшчэ вельмі і вельмі многа папрацаваць, каб ператварыць родную сталіцу ў самы добраўпарадкаваны, самы культурны, самы ўзорны горад на зямлі.

Таварышы! Наш народ паказаў цуды рэвалюцыйнага гераізму ў кастрычніку 1917 года, цуды мужнасці і храбрасці на франтах грамадзянскай вайны, цуды стойкасці, самаахвярнасці і самаадданасці Радзіме ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сваёй працай ён ператварыў адсталую, убогую і бяссільную Русь у перадавую дзяржаву свету. Такі народ — волат, стваральнік, кіруемы сваёй роднай партыяй і яе Ленінскім ЦК, — пабудуе камунізм!

ЛЕНІНІЗМ—СЦЯГ БАРАЦЬБЫ ЗА ДРУЖБУ НАРОДАЎ, МІР І САЦЫЯЛІЗМ

Неадольную сілу набыў у наш час рух народаў да вялікай мэты, указанай Марксам, Энгельсам, Леніным,—да камунізма.

У свой час праціўнікі ленінізма спрабавалі паказаць яго чыста рускай з'явай, замкнуць у нацыянальных межах.

Але гэтыя спробы аказаліся дарэмнымі. Як нельга пагасіць Сонца, так нельга спыніць пашырэнне ленінскіх ідэй.

Трыумф творчага марксізма-ленінізма з новай сілай прадэманстравала Маскоўская Нарада прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый у лістападзе 1960 года.

Нарада з'явілася самай выдатнай палітычнай падзеяй апошняга часу, новым яскравым доказам поспехаў сусветнага камуністычнага руху, яго згуртаванасці і адзінства.

Яна наглядна паказала вялікія клопаты камуністаў аб вырашэнні карэнных праблем, якія стаяць перад чалавецтвам.

Народы ўсяго свету бачаць, што камунізм з'яўляецца носьбітам самых высокіх, гуманных ідэалаў чалавецтва, што камуністы выступаюць сцяганосцамі ў барацьбе за прадухіленне войнаў і іх выкараненне на вечныя часы.

На аснове ленінскага аналізу сусветнага развіцця Нарада дала характарыстыку асаблівасцей сучаснай эпохі.

«Галоўная адметная рыса нашага часу, — гаворыцца ў Заяве Нарады, — **заключаецца ў тым, што сусветная сацыялістычная сістэма ператвараецца ў рашаючы фактар развіцця чалавечага грамадства».**

Пасля Нарады камуністычных і рабочых партый прайшло нямнога часу. Аднак і за гэты кароткі тэрмін можна было пераканацца, якое велізарнае значэнне маюць палажэнні і вывады, змешчаныя ў яе дакументах.

Жыццё прыносіць усё новыя і новыя пацвярджэнні таго, што суадносіны сіл на сусветнай арэне няўхільна змяняюцца ў карысць сацыялізма.

Сацыялістычныя краіны аказваюць уздзеянне на ход сусветнага развіцця перш за ўсё сваім гаспадарчым будаўніцтвам, поспехамі ў эканамічным спаборніцтве з капіталістычнай сістэмай.

У 1960 годзе выпуск прамысловай прадукцыі сацыялістычнага лагера амаль у сем разоў перавышаў даваенны ўзровень, а прадукцыя капіталістычных краін узрасла за той жа перыяд менш чым у 2,5 раза.

Ці даўно доля сацыялізма была роўнай толькі адной дзесятай сусветнай прамысловай вытворчасці? А ў цяперашні час краіны сацыялізма выпускаюць больш чым трэць усёй сусветнай прамысловай прадукцыі. Ужо ў бліжэйшы час сацыялістычная сістэма пераўзыдзе капіталістычную па абсалютных размерах вытворчасці.

У той час як сацыялізм атрымлівае ўсё новыя поспехі, капіталізм ідзе ўсё далей па шляху разлажэння і заняпаду.

Прыхільнікі капіталізму не могуць адмаўляць таго відавочнага факту, што самая магутная капіталістычная дзяржава — ЗША — чацвёрты раз за пасляваенныя гады перажывае эканамічны крызіс.

Хранічнае, пастаянна ўзрастаючае беспрацоўе стала сапраўдным бедствам для амерыканскага рабочага класа. Колькасць поўнасцю беспрацоўных у ЗША перавышае пяць мільёнаў чалавек.

Каля сотні галоўных прамысловых раёнаў краіны, дзе асабліва многа беспрацоўных, афіцыяльна аб'яўлены «бядотнымі».

Пасля вайны манаполіі і, перш за ўсё, амерыканскія, спадзяваліся з дапамогай мілітарызацыі эканомікі, шалёнай гонкі ўзбраенняў падтрымаць высокі ўзровень вытворчасці, пазбегнуць эканамічных крызісаў і росту беспрацоўя.

Яны разлічвалі, што высокая занятасць, выкліканая ваеннымі заказамі, аслабіць барацьбу рабочага класа, што пры дапамозе паліцэйскіх рэпрэсій удасца падавіць рабочы рух, задушыць камуністычныя партыі.

Праводзячы палітыку з «пазіцыі сілы», яны імкнуліся падарваць магутнасць сацыялістычнага лагера.

Але гэтым разлікам не суджана збыцца. Мілітарызацыя эканомікі, гонка ўзбраенняў, курс на падрыхтоўку вайны прыводзяць да далейшага аслаблення пазіцый імперыялізму, выклікаюць да яго яшчэ большую нянавісць працоўных мас.

Што ж датычыць іх спроб падарваць сілы сацыялізма, то яны поўнасцю праваліліся.

Краіны сацыялізма моцныя сваім маналітным адзінствам. Гэта не звычайная кааліцыя дзяржаў, звязаная толькі часовымі, мінучымі інтарэсамі.

Сацыялістычныя краіны аб'яднаны агульнасцю эканамічнага, сацыяльнага і палітычнага ладу, агульнасцю ідэалогіі марксізма-ленінізма, агульнасцю інтарэсаў і мэт.

Свет сацыялізма — гэта жывое ўвасабленне пралетарскага інтэрнацыяналізму.

«Старому свету, свету нацыянальнага прыгнечання, нацыянальнай грызні або нацыянальнага адасаблення, — гаварыў Ленін, — рабочыя процістаўляюць новы свет адзінства працоўных усіх нацый, у якім няма месца ні для адной прывілеі, ні для малейшага прыгнечання чалавека чалавекам». (Творы, том 19, стар. 72).

Гісторыя чалавецтва не ведае такой згуртаванасці, якая дасягнута ў магутнай садружнасці сацыялістычных краін.

Уладзімір Ільіч Ленін нястомна падкрэсліваў велізарнае значэнне адзінства класавай барацьбы рабочых за камунізм ва ўсім свеце.

Цяпер, калі народы сацыялістычных краін пад кіраўніцтвам сваіх марксісцка-ленінскіх партый будуюць сацыялізм і камунізм, калі перад рабочым класам стаяць сусветна-гістарычныя задачы, значэнне адзінства камуністычных і рабочых партый яшчэ больш узрастае.

Умацоўваючы садружнасць сацыялістычных краін, камуністы выхоўваюць народныя масы ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, у духу дружбы і братэрства народаў.

Паслядоўна выступаючы супраць праяўленняў нацыянальнай абмежаванасці, камуністычныя партыі ўсямерна ўмацоўваюць адзінства, супрацоўніцтва і ўзаемную дапамогу сацыялістычных дзяржаў.

Усімі сваімі перамогамі камуністычны рух абавязан вернасцю марксізму-ленінізму. Кіруючыся ленінскім вучэннем, творча развіваючы яго далей, прымяняльна да новай гістарычнай эпохі, камуністычныя партыі дабіваюцца выдатных поспехаў у барацьбе за перамогу камунізма.

Цяпер у свеце налічваецца 87 марксісцка-ленінскіх партый, якія аб'ядноўваюць у сваіх радах звыш 36 мільёнаў чалавек.

Гэтая велізарная армія барацьбітоў моцная не толькі сваёй колькасцю, але, што яшчэ важней,— сваім баявым духам, непахісным адзінствам, адданасцю ідэям марксізма-ленінізма.

Пад сцягам ленінізма камуністычны рух ператварыўся ў самую ўплывовую палітычную сілу нашага часу. Камуністы стаяць на чале ўлады ў сацыялістычных краінах, узначальваюць рабочы клас капіталістычных краін, ідуць у авангардзе нацыянальна-вызваленчага руху. З'явіліся новыя, больш спрыяльныя магчымасці для вырашэння карэнных праблем сучаснасці ў інтарэсах міру, нацыянальнай незалежнасці, дэмакратыі і сацыялізма.

Таварышы! Адным з найвялікшых фактаў сучаснасці, што пацвярджае правільнасць ленінізма, з'яўляецца выхад на арэну самастойнай гістарычнай творчасці многіх народаў, якія знаходзіліся ў каланіяльным рабстве.

Ленін паказаў, што сацыялістычныя рэвалюцыі, прабіваючы праломы ў сістэме імперыялізму і аслабляючы яго, аблягчаюць перамогу народам калоній і залежных краін над іншаземнымі прыгнятальнікамі, адкрываюць перад імі магчымасць заваяваць свабоду і стаць на шлях незалежнага нацыянальнага развіцця.

Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычных рэвалюцый у радзе іншых краін Еўропы і Азіі вельмі падарвала пазіцыі імперыялізму, стварыла спрыяльныя ўмовы для ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху, натхніла народы на барацьбу за свабоду.

Працэс гібелі каланіялізму асабліва паскорыўся пасля ўтварэння сусветнай сацыялістычнай сістэмы. За пасляваенны перыяд дзесяткі краін з насельніцтвам у паўтара мільярда чалавек назаўсёды пакончылі з іншаземным заняволеннем.

Грозная лавіна нацыянальна-вызваленчага руху знішчае гэтую ганебную сістэму. Услед за Азіяй узнялася Афрыка. Перамога глыбока народнай кубінскай рэвалюцыі запаліла надзеяй сэрцы мільёнаў людзей у Лацінскай Амерыцы.

Ленінская ідэя аб узаемнай сувязі сацыялістычных і антыімперыялістычных, нацыянальна-вызваленчых рэвалюцый жыве і перамагае.

Народы, якія вызваліліся, па ўласнаму вопыту ведаюць, што сацыялістычныя краіны, камуністычныя і рабочыя партыі — іх самыя верныя сябры і саюзнікі ў свяшчэннай барацьбе за нацыянальную незалежнасць, супраць імперыялізму.

Каланіялізм пацярпеў цяжкія паражэнні, але ён яшчэ жывы і служыць крыніцай многіх канфліктаў, якія ствараюць пагрозу новай вайны. Чым, як не ўспышкамі злоснага шаленства каланізатараў, з'яўляюцца забойства нацыянальнага героя Конга Патрыса Лумумбы, злачынствы ў Алжыры, падзеі ў Лаосе, узброенае ўварванне на Кубу?

Арганізаваная Злучанымі Штатамі інтэрвенцыя супраць Кубы справядліва расцэнена сусветнай грамадскасцю, як адкрыты выклік свабодалюбівым народам, як небяспечная правакацыя ў раёне Карыбскага мора, супраць усеагульнага міру. Манаполіі ЗША баяцца, што Куба, якая будуе новае жыццё, з'явіцца прыкладам для іншых краін Лацінскай Амерыкі.

Кубінскі народ не стаў і не стане на калені. Ён прайшоў суровую школу барацьбы супраць замежных прыгнятальнікаў і іх памагатых і не дазволіць зноў надзець на сябе ярмо заняволення.

У сваёй свяшчэннай барацьбе народ Кубы не адзінокі. Сацыялістычныя дзяржавы разам з усімі свабодалюбівымі сіламі выказалі салідарнасць з кубінскім народам.

Заява ўрада СССР у сувязі з узброеным уварваннем на Кубу і Пасланне Старшыні Савета Міністраў СССР таварыша М. С. Хрушчова прэзідэнту ЗША з'явіліся магутнай падтрымкай кубінскаму народу ў яго барацьбе за сваю незалежнасць, сур'ёзнай перасцярогай імперыялістычным агрэсарам.

Гераічны народ Кубы пад кіраўніцтвам нацыянальнага героя Фідэля Кастра раздушыў інтэрвентаў. Ён поўны непахіснай рашучасці адстаяць сваё права будаваць новае жыццё.

Усе савецкія людзі горача віншуюць кубінскі народ з гэтай важнай перамогай над сіламі імперыялізму.

Камуністы зыходзяць з таго, што кожны народ мае права сам вырашаць пытанне аб унутраным ладзе сваёй краіны! Яны адмаўляюць экспарт рэвалюцыі, але рашуча выступаюць і супраць экспарту контррэвалюцыі. Ленін не раз падкрэсліваў, што ні аднаму народу не можа быць навязана сілай якое б там ні было «ашчасліўліванне». Камуністычныя і рабочыя партыі, прытрымліваючыся гэтых ленінскіх указанняў, лічаць сваім інтэрнацыянальным абавязкам даваць рашучы адпор умяшанню імперыялістаў у справы народа любой краіны, які змагаецца за сваю незалежнасць і новае жыццё.

Падзеі на Кубе, у Конга, Лаосе вучаць народы пільнасці ў адносінах да падкопаў імперыялізму, неабходнасці ўмацоўваць салідарнасць свабодалюбівых народаў.

Няма такіх сіл, якія маглі б спыніць заканамерны працэс гібелі сістэмы імперыялістычнага прыгнечання, як няма ў прыродзе сіл, якія маглі б спыніць вярчэнне Зямлі.

Імперыялісты стараюцца сабраць усе сілы рэакцыі пад флагам антыкамунізма.

Антыкамунізм на справе азначае абарону панавання найбольш агрэсіўных і прагных колаў манапалістычнага капіталу, наступленне на ўсе дэмакратычныя сілы, насаджэнне і адкрытую падтрымку дыктатарскіх, крывавых рэжымаў.

Антыкамунізм — гэта сцяг рэакцыі, мілітарызму і падрыхтоўкі вайны. Пад флагам антыкамунізма вядзецца гонка ўзбраенняў, праводзіцца палітыка, накіраваная на ўмацаванне агрэсіўнага блоку НАТО, у якім усё большую ролю адыгрываюць заходнегерманскія рэваншысты, што ператвараюць Заходнюю Германію ў галоўны ачаг ваеннай небяспекі ў Еўропе.

Сацыялістычныя краіны, упэўненыя ў сваёй сіле і магутнасці, процістаўляюць імперыялістычнай палітыцы агрэсіі і ваенных авантур ленінскую палітыку міру і мірнага суіснавання. Ленінізм указвае шлях да вырашэння самай надзённай праблемы сучаснасці — праблемы міру.

Вялікі барацьбіт за мір М. С. Хрушчоў неаднаразова падкрэсліваў, што цяпер ёсць толькі два шляхі сусветнага развіцця: або мірнае суіснаванне паміж дзяржавамі з рознымі сацыяльнымі сістэмамі, або знішчальная ракетна-ядзерная вайна. Трэцяга не дадзена!

Наша барацьба за мір — не часовы тактычны прыём, а генеральная лінія знешняй палітыкі СССР, якая вызначаецца самой прыродай сацыялізма.

Вывад XX з'езда партыі аб магчымасці прадухілення войнаў у сучасную эпоху заснаван на глыбокім аналізе міжнароднага становішча, суадносін сіл міру і вайны. Правільнасць і своечасовасць гэтага вываду даказана жыццём.

Аб'яднанымі намаганнямі сусветнага сацыялістычнага лагера, рабочых усіх краін, нацыянальна-вызваленчага руху і ўсіх міралюбівых сіл можна спыніць агрэсіўныя падкопы імперыялістаў, прымусіць іх адмовіцца ад ваенных авантур.

Савецкі Саюз і іншыя сацыялістычныя краіны ў сваёй знешняй палітыцы няўхільна праводзяць ленінскі курс на мірнае суіснаванне, на вырашэнне шляхам перагавораў усіх спрэчных міжнародных пытанняў, на развіццё ўзаемавыгадных эканамічных і культурных сувязей паміж усімі краінамі.

Найбольш правільнай гарантыяй міру з'яўляецца ўсеагульнае і поўнае раззбраенне, якое Ленін назваў ідэалам сацыялізма.

Наш урад выставіў праграму ўсеагульнага і поўнага раззбраення пад строгім міжнародным кантролем, унёс рад важных прапаноў, накіраваных на змякчэнне міжнароднага становішча.

Аднак, пакуль імперыялістычныя колы праводзяць сваю агрэсіўную палітыку, сацыялістычныя краіны, як падкрэсліў Палітычны Кансультатыўны Камітэт дзяржаў — удзельніц Варшаўскага дагавору, не могуць заставацца безудзельнымі сведкамі растучых ваенных падрыхтаванняў з боку імперыялістычных дзяржаў.

Сацыялістычныя дзяржавы прымаюць неабходныя меры для далейшага ўмацавання сваёй абараназдольнасці і ўмацавання міру ва ўсім свеце.

Міралюбівая знешняя палітыка сацыялістычных краін прыцягвае да сябе сімпатыі самых шырокіх слаёў сусветнай грамадскасці, аказвае велізарнае мабілізуючае ўздзеянне на барацьбу народаў за мір, супраць імперыялізму.

Найглыбейшая крыніца сілы і эфектыўнасці нашай знешняй палітыкі заключаецца іменна ў тым, што яна адпавядае жыццёвым інтарэсам народных мас усіх краін.

Сацыялізм прадстае перад чалавецтвам як надзейная апора міру і свабоды, як сіла, якая здольна абараніць народы ад жахаў ядзерна-ракетнай вайны.

Курс на мірнае суіснаванне дапамагае згуртаванню велізарнай большасці насельніцтва зямлі на барацьбу супраць ворагаў міру, садзейнічае яшчэ большаму росту аўтарытэту і ўплыву камуністычных і рабочых партый, сусветнай сістэмы сацыялізма.

Таварышы!

Камуністычная партыя Савецкага Саюза і яе баявы штаб—Цэнтральны Камітэт на чале з выдатным ленінцам Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым упэўнена вядуць нашу Радзіму па шляху, указаным вялікім Леніным.

Усё жыццё краіны і партыі, усе яе буйнейшыя мерапрыемствы па стварэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, развіццю і ўдасканаленню грамадскіх адносін, камуністычнаму выхаванню працоўных, уся наша нястомная барацьба за ўмацаванне сусветнай сацыялістычнай сістэмы і ўмацаванне міру ва ўсім свеце непарыўна звязаны з нястомнай, шматграннай дзейнасцю нашага ленінскага ЦК і Першага Сакратара Цэнтральнага Камітэта партыі Мікіты Сяргеевіча Хрушчова.

Непарыўная сувязь з найшырэйшымі масамі, велізарны жыццёвы і рэвалюцыйны вопыт, уменне бачыць новае і адкрываць яму шырокую дарогу ў жыццё здабылі Мікіту Сяргеевічу Хрушчову высокае давер'е і аўтарытэт у партыі і народзе.

Партыя і народ бачаць у таварышу Хрушчове дастойнага прадаўжальніка неўміручай ленінскай справы.

Сёння, у гадавіну з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва схіляюцца перад веліччу ленінскага генія, з вялікай любоўю і ўдзячнасцю яны ўшаноўваюць свайго правадыра і настаўніка.

Усё, што ёсць лепшага, усё, што ёсць вялікага ў чалавецтва, знайшло сваё ўвасабленне ў Леніне, у ленінізме.

Ёсць людзі, значэнне якіх неяк не ахапляецца чалавечым словам, —гаварыў Аляксей Максімавіч Горкі ў дзень пяцідзесяцігоддзя Леніна.—Такім чалавекам не толькі для Расіі, а для ўсяго свету, для ўсёй нашай планеты з'яўляецца Уладзімір Ільіч.

Ленін—сімвал новага свету!

З імем Леніна савецкія людзі будуюць камунізм.

З імем Леніна атрымліваюць перамогі братнія краіны, якія будуюць сацыялізм.

З імем Леніна ўсе камуністычныя і рабочыя партыі вядуць барацьбу за мір, дэмакратыю, сацыялізм, за шчасце чалавека на зямлі.

Ленін — заўсёды з намі. Разам з Леніным мы ўвойдзем у будучае камуністычнае грамадства.

Няхай жыве ленінізм — пераманосны сцяг нашай эпохі — эпохі трыумфу камунізма!

(Даклад, які неаднаразова перапыняўся апладысментамі, закончан. Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння стоячы спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал»).

Імя правадыра

Адно з буйнейшых кнігасховішчаў нашай краіны — Дзяржаўная бібліятэка БССР ужо амаль тры дзесяцігоддзі носіць імя вялікага правадыра Ул. І. Леніна. Створаная ў 1921 г. пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, яна праз год пачала існаваць як самастойнае кнігасховішча. У цяперашні час тут налічваецца каля 2 мільёнаў 700 тысяч кніг.

У бібліятэку паступаюць абавязковыя экземпляры ўсіх кніг, якія выдаюцца ў нашай краіне. Акрамя таго, яна атрымлівае многа назваў перыядычных выданняў з зарубежных краін.

Вельмі цікавыя рэдкія выданні прац Ул. І. Леніна, якія захоўваюцца ў бібліятэцы. Сярод іх кнігі «Крок уперад, два крокі назад», «Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі», «Задачы рускіх сацыял-дэмакратаў», «Пісьмо ў рэдакцыю «Искры», «Да вясковай беднаты» і іншыя, выйшлі ў дарэвалюцыйныя гады ў Жэневе. Тут жа ёсць першае выданне «Капіталу» Карла Маркса, кніга Фрыдрыха Энгельса «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы», рэдкія выданні «Маніфеста Камуністычнай партыі» на рускай, нямецкай, англійскай і французскай мовах.

Да 91-й гадавіны з дня нараджэння Ул. І. Леніна ў бібліятэцы была адкрыта выстаўка літаратуры і фотаілюстрацый. На ёй прадстаўлены дакументы і матэрыялы, якія адлюстроўваюць жыццё і рэвалюцыйную дзейнасць вялікага правадыра. Наведвальнікі знаёмяцца са шматлікімі выданнямі прац Ул. І. Леніна, якія выйшлі на рускай і беларускай мовах. Экспануюцца таксама кнігі Ільіча, выдадзеныя на кітайскай, польскай, карэйскай, балгарскай, англійскай, французскай і многіх іншых мовах народаў свету.

Значнае месца на выстаўцы займаюць успаміны аб Леніне. У гэтых кнігах выказана бязмежная любоў народа да стваральніка Камуністычнай партыі і першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы Ул. І. Леніна.

(БЕЛТА).

Рысы вялікага вобраза

Да 91-й гадавіны з дня нараджэння вялікага правадыра працоўных усяго свету Уладзіміра Ільіча Леніна Беларуская дзяржаўная філармонія наладзіла цікавыя мерапрыемствы.

З літаратурнай кампазіцыяй «Рысы вялікага вобраза» перад працоўнымі Мінска выступілі музыказнаўца А. Маслоўскі і артыстка М. Чайгорская. У гарадах нашай рэспублікі з поспехам прайшлі вечары Сяргея Сакагова, які выступаў з кампазіцыяй «Самы чалавечны чалавек».

Літаратурныя канцэрты на тэму «Вобраз Леніна ў беларускай літаратуры» адбыліся з удзелам заслужанага дзеяча культуры БССР А. Слесарэнкі.

Канцэрт-лекцыя «Музыка ў жыцці Леніна» быў наладжаны для супрацоўнікаў Мінскага будтрэста нумар пяць. Прысутныя з вялікай увагай праслухалі гутарку кансультанта Мінскай гарадской нотна-музычнай бібліятэкі М. Жухавіцкага, які расказаў ім аб значэнні музыкі ў жыцці вялікага Леніна. Артысты Беларускай філармоніі і Беларускага радыё выканалі шэраг любімых твораў Ільіча.

Музыку любяць мільёны

Няспынна расце культурны ўзровень нашага народа. Шырокія масы працоўных праяўляюць вялікую цікавасць да авалодання музычнай культурай.

Рашаючая роля ў паляпшэнні музычнай прапаганды ў рэспубліцы належыць філармоніі. Яна—асноўны арганізатар выступленняў гастрольных калектываў і салістаў Савецкага Саюза, а таксама канцэртаў зарубежных выканаўцаў.

Каб пашырыць прапаганду музыкі сярод працоўных і дапамагчы ў гэтай справе ўніверсітэтам культуры, пры Беларускай філармоніі створана музычна-літаратурнае канцэртнае бюро. Акрамя таго, наш творчы калектыў сумесна з Камітэтам радыёвяшчання і тэлебачання наладжвае канцэрты сімфанічнага аркестра для дзяцей і юнацтва. Гэта, безумоўна, паспрыяе выхаванню добрага музычнага густу ў школьнікаў.

Будуць таксама арганізаваны выезды Дзяржаўнага народнага аркестра БССР са спецыяльна абсталяванай канцэртнай эстрадай у калгасы і саўгасы рэспублікі.

Значна вырасла сетка ўніверсітэтаў культуры і музычных лекторыяў пры клубах і палацах культуры прамысловых прадпрыемстваў і навучальных устаноў. Упершыню філармонія наладзіла музычныя лекторыі на вёсцы, у якіх праведзен ужо цыкл лекцый-канцэртаў.

Але ёсць яшчэ шмат нявырашаных праблем. Як вядома, любоў да музыкі павінна выхоўвацца ў школе, аднак у большасці школ, на жаль, пакуль што не праводзяцца паўнацэнныя заняткі па музыцы. Тым большае значэнне павінны былі б набыць школьныя лекцыі-канцэрты, якія наладжвае філармонія сумесна з Палацам культуры прафсаюзаў. Але дырэктары школ і аддзелы народнай асветы Мінска адносяцца з пагардай да музычна-лекцыйнай прапаганды і таму ў тэатральнай зале Палаца прафсаюзаў, якая мае 800 месц, прысутнічае часам 250—500 вучняў, нягледзячы на тое, што лекцыі-канцэрты праводзяцца бясплатна. Палац прафсаюзаў чамусьці прымае ў сябе любыя эстрадныя брыгады і заўсёды адмаўляецца ад выступленняў артыстаў, якія прыязджаюць з лекцыямі-канцэртамі.

Многія работнікі культуры на перыферыі таксама яшчэ не могуць зразумець усёй важнасці музычна-прапагандысцкай работы і часам ставяцца да яе абыякава. Так, адночы загадчык Капаткевіцкага Дома культуры не падрыхтаваў для выязной брыгады філармоніі піяніна і абурыўся, што яна ездзіць без свайго інструмента, а прымушае яго, загадчыка клуба, пра гэта клапаціцца. Ён прапанаваў артыстам выступаць пад акампанемент... мясцовага баяніста. І хаця ў рэпертуары спевакоў былі арыі з рускіх класічных опер і рамансы, ён заявіў: «А вы ўсё ж праспявайце нашаму музыканту, ён па слыху падбярэ мелодыю і сыграе».

Зразумела, калі культурную ўстанову ўзначальвае такі «дзеяч», дык пра музычна-эстэтычнае выхаванне працоўных раёна і гаварыць не даводзіцца.

Або вось яшчэ адзін факт: у гарадскім пасёлку Гарадзішча Брэсцкай вобласці пасля першай лекцыі-канцэрта слухачы, задаволеныя ёю, выказалі настойлівае жаданне арганізаваць на наступны дзень яшчэ адну лекцыю. Філарманічная брыгада якраз мела такую магчымасць. Але кіраўніцтва раённага аддзела культуры катэгарычна было супраць правядзення другой лекцыі. І гэта тады, калі ўсе нашы лекцыі-канцэрты ў раённых дамах культуры і сельскіх клубах праводзяцца як правіла бясплатна.

Трэба дамагацца, каб на чале ўсіх культурна-асветных устаноў стаялі дасведчаныя і ініцыятыўныя людзі, здольныя арганізоўваць на месцах выхаваўчую работу сярод насельніцтва.

Ёсць яшчэ адзін прыватны, але вельмі істотны фактар, які дрэнна ўплывае на якасць музычнай прапаганды. У многіх клубах, асабліва калгасных, і ў раённых дамах культуры няма клавішных інструментаў. Тыя ж, што ёсць, знаходзяцца ў самым дрэнным становішчы. Іх трэба неадкладна прыводзіць у парадак.

Цяжка часам набыць новы інструмент. Так, многім інстытутам патрэбны канцэртныя раялі, але плануючыя органы не ўлічваюць і не задавальняюць іх запатрабаванняў.

Патрабуе карэннага паляпшэння і папулярызацыя камернай музыкі. Наша рэспубліка адзіная, дзе няма дзяржаўных камерных ансамбляў. І зусім справядліва ў часопісе «Советская музыка» крытыкавалася Міністэрства культуры БССР за тое, што не знайшло сродкаў на арганізацыю струннага аркестра.

Перашкод на шляху музычнай прапаганды нямала. Хацелася б, каб іх зусім не было.

А. КАЛАНДЗЕНАК,
дырэктар Белдзяржфілармоніі.

З БАГАТАЙ НАРОДНАЙ СКАРБНІЦЫ

Разглядаючы гісторыю прафесіянальнай музыкі, не цяжка заўважыць, што ўсе найбольш яркія і значныя старонкі ў яе развіцці былі звязаны з тым, калі кампазітары звярталіся да крыніцы мастацтва свайго народа. Вось чаму кожны раз выклікаюць цікавасць новыя публікацыі народнай музычна-паэтычнай творчасці, асабліва калі яны належаць буйнаму спецыялісту, чуламу і ўдумліваму музыканту.

З задавальненнем сустрэла наша грамадскасць выданне музычна-фальклорных матэрыялаў выдатнага беларускага фалькларыста Р. Шырмы, якое пачалося ў апошнія гады. У 1959 г. быў выдадзены першы з чатырох запланаваных тамоў яго капітальнай працы «Беларускія народныя песні». У 1960 г. выйшаў у свет другі том.

Характар такіх буйных публікацый музычнага фальклору заўсёды вызначае пэўнае творчае стаўленне аўтара да сабранага ім матэрыялу. У гэтых адносінах запісы народных песень, зробленыя Р. Шырмам, — узор яго высокай патрабавальнасці, мастацкай інтуіцыі і вялікай любві да сваёй справы.

Характэрная рыса песень, якія публікуюцца, — іх жанравая, стылічная і мастацкая разнастайнасць. У абодвух тамах аўтар адыйшоў ад традыцыі, якая ўсталявалася за апошнія гады ў беларускай фальклярыстыцы, размяшчаць матэрыял у жанрава-храналагічным парадку, г. зн. пачынаючы з песень найбольш старадаўніх — каляндарных і канчаючы сучаснымі. Дарэчы, такі прынцып паслядоўна вытрыманы ў анталогіі «Песні беларускага народа» Г. Цітовіча. Гэты прынцып, на нашу думку, найбольш метадалагічна мэтанакіраваны, але не з'яўляецца адзіным і тым больш абавязковым. Думаецца, што калі ў першым песенным томе Р. Шырмы гэтаму прынцыпу яшчэ не працівастаўлялася якая-небудзь цэласная сістэма, дык у другім згрупаванне розных жанраў па трох больш буйных цыклах арганічна сістэматызуе матэрыял, раскрываючы ідэйна-тэматычны змест беларускай народнай песнятворчасці.

Каля паловіны запісаў з другога тома — песні аб «жаночай долі». Матывы цяжкага становішча беларускай жанчыны пранізваюць і большасць астатніх жанраў беларускай дарэвалюцыйнай музычнай творчасці. Уласна, да гэтага цыкла песень у значнай меры можна аднесці песні аб «недабранай пары», «сіроцкія», не гаворачы ўжо пра песні традыцыйныя каляндарныя.

Своеасаблівай прыгажосцю, маляўнічай паэтыкай і меладычным багаццем вызначаюцца такія песні, як «Шумяць вербы», «А ў бары сасна». Тыповы сюжэт падобных народных элегій можна бачыць і ў песні «Ой, за бор, за бор», распаўсюджанай па ўсёй Беларусі ў мностве варыянтаў.

Многа добрых і запамінальных напеваў ёсць сярод «хрэсьбінных» песень. Варта таксама вылучыць некаторыя рэкруцкія песні, якія ярка адлюстравалі пачуццё народнай роспачы і гневу.

Своеасаблівасцю старажытнага ўсходне-славянскага фальклору адзначана песня «Ой, калінушка, ой, малінушка», якая з'яўляецца, відаць, асновай для шматлікіх варыянтаў вядомай салдацкай песні «Ой, ды ты, каліна».

Другі том Р. Шырмы каштоўны яшчэ тым, што ў ім прыводзяцца варыянты песень (тэкставыя і меладычныя). Можна гаварыць пра тое, які з гэтых варыянтаў мастацкі больш каштоўны, але ўсе яны маюць права на існаванне ў зборніку такога профілю, бо даюць уяўленне аб стылістычнай разнастайнасці нацыянальнага музычнага фальклору.

Вывучэнне беларускага песеннага шматгалосся — адна з надзённых праблем нашай фальклярыстыкі. На шляху паспяховага вырашэння гэтай праблемы стаіць пакуль што, здавалася б, адна перашкода — адсутнасць значнай колькасці шматгалосных песень. Вось чаму выклікаюць цікавасць апублікаваныя ў другім томе прыклады двухгалосных песень «Свяці, месяц», «Эй, у Слуцку-горадзе» і асабліва «Шумелі бярозы». Апошняя спалучае ў сабе моманты дэкламацыі быліннага характару з шырокай распеўнасцю.

Вельмі важны ў другім томе таксама раздзел «Песні няволі і змагання». Лепшыя ўзоры гэтых песень запісваліся Шырмам не па ўскраінах людзей, а ў абстаноўцы вострай барацьбы беларускага народа супраць сваіх прыгнятальнікаў. Так, апублікаваная песня «Пад гоман вясёлы» была запісана ў 1935 г. ад камсамольцаў-падпольшчыкаў Заходняй Беларусі. Гэта — пераасэнсаванне старадаўняй валачобнай песні, прасякнутай інтанацыямі вядомай «Варшавянкі».

Якія б добрыя самі па сабе ні былі народныя песні, якім бы важнейшым мастацкім і навуковым дакументам творчасці народа яны не з'яўляліся, іх эмацыянальны падтэкст здольны раскрыць толькі жывы чалавечы голас. Дзякуючы чулай і правільнай інтэрпрэтацыі спевака-выканаўцы, народная песня можа набыць сваё сапраўднае жыццё і дайсці да сэрца слухачоў. І тут ужо справа за нашымі канцэртнымі арганізацыямі і радыё, за ўсімі тымі, каму павінны быць дарагія інтарэсы беларускага музычнага мастацтва.

Песні са зборніка Р. Шырмы — удзячны і каштоўны матэрыял для нашых салістаў і харавых калектываў.

В. ЕЛАТАЎ,
кандыдат мастацтвазнаўчых навук.

На самадзейнай сцэне

Ансамбль народнага танца Віцебскага раённага Дома культуры — адзін з лепшых сярод самадзейных калектываў вобласці. Ён не раз з поспехам выступаў у Мінску і ў многіх іншых гарадах і вёсках нашай рэспублікі, а таксама суседняй Смаленскай вобласці. Усяго за дзесяць год свайго існавання ансамбль даў звыш 800 канцертаў.

НА ЗДЫМКАХ: 1. Удзельніцы ансамбля Люда МАРЧАНКАВА (злева) і Валя КАЛІНЕНКА перад выхадам на сцэну.

2. Група ансамбля выконвае беларускі народны танец «Лявоніха».

Фота С. Капелькі.
Фотахроніка БЕЛТА.

ЧЫТАЧ ПРАЦЯГВАЕ РАЗМОВУ

ПА ПРЫНЦЫПУ: І ТАК, І ГЭТАК

Пасля пастановы Савета Міністраў БССР «Аб удасканаленні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу» (май 1957) «Руска-беларускі слоўнік» (1953) і асабліва «Арфаграфічны слоўнік» М. Судніка і М. Лобана (1948) у нейкай ступені ўстарэлі. Таму работнікі друку, радыё, настаўнікі і наогул уся грамадскасць рэспублікі прыхільна сустрэлі выхад у свет новага арфаграфічнага слоўніка тых жа аўтараў. Ён паспрыяе ліквідацыі разнабою ў напісанні пасасобных слоў, які ўзнік за апошнія гады (паколькі пасля выдання пастановы ніякіх дапаможнікаў па мове, якія адпавядалі б патрабаванням часу, не было, калі не лічыць «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959) і невялічкага слоўніка, змешчанага ў кайцы гэтых «Правіл»), аблегчыць працу выкладчыкам мовы і літаратуры ў школе.

У артыкуле «Пашыраны і ўдасканалены» («Літаратура і мастацтва» ад 31 сакавіка г. г.) Ірына Саковіч слушна зазначыла, што цяперашні «Арфаграфічны слоўнік» «перарос асноўнае сваё прызначэнне—быць толькі арфатрафічным». Няма патрэбы пераказваць усіх вартасцей слоўніка, іх многа і пра іх добра сказана ў памянёным артыкуле. Хацелася б зрабіць некалькі крытычных заўваг.

У канцы слоўніка даецца пералік найбольш пашыраных геаграфічных назваў, прозвішчаў і імёнаў. Узяць, да прыкладу, назвы такіх вядомых гарадоў нашай краіны, як Арэнбург, Какчэтаў, Чэлябінск, Чэркасы, Чэркеск. Чаму тут э захоўваецца не пад нашым? Калі некаторыя з назваў, магчыма, і косяць сляды іншамоўнага (неславянскага) паходжання, дык і ў гэтым выпадку іх можна смела залічыць да слоў, якія даўно запазычаны з неславянскіх моў. Пішам жа мы **аранжарэя, латарэя** (французскія словы) і г. д.

Таксама правільна мяркуе І. Саковіч, што такія імёны, як **Вольга, Восіп**, можна было без вагання ўключыць у слоўнік.

Даецца некалькі варыянтаў напісання беларускіх імён і пры гэтым зазначаецца: уключэнне часткі ўласных імён у слоўнік не азначае таго, што яны павінны ўжывацца толькі ў тых варыянтах, у якіх яны пададзены ў слоўніку. Вядома, можна сказаць Аўгіння і Яўгенія, Соф'я і Зося. А што датычыць імён, якія канчаюцца на **-ій (-ый)**, дык яны ўжываюцца ўсё менш і менш. Замест **Васілій** пішуць **Васіль**, замест **Генадзій—Генадзь** і г. д. Так пісаць зручней, да таго ж гэта больш уласціва беларускаму вымаўленню. Ды і для вучняў яно лепей. Чым менш выключэнняў мае правіла, тым яно больш дасканалае. І сапраўды, беларускія і іншыя прозвішчы са славянскай лексічнай асновай, якія маюць форму поўнага прыметніка, у назоўным склоне мужчынскага роду пішуцца без **й: Гартны, Вазнясенскі, Новатны** і г. д. У той жа час у імёнах са славянскай лексічнай асновай і ў іншамоўных імёнах і нават прозвішчах й захоўваецца **(Авідзій, Лукрэцый, Флавій** і г. д.). Гэта не зусім лагічна. Дарэчы, многія беларускія пісьменнікі і раней пазбягалі пісаць, скажам, **Яўгеній** ці **Аркадзій**, а пісалі **Яўгені, Аркадзь**, чым фактычна пацвярджалі няўдалась ужывання формы напісання імён з й на канцы.

Добра, што ў слоўніку пададзены толькі адзін варыянт напісання такіх імён, як **Мікалай і Мікіта**. Значыць, і ўсе вытворныя ад гэтых імён павінны пісацца з літары **м**. Гэта зусім заканамерна. Магчыма, больш дакладна было б напісаць **Мікалаеў (Мікалаеўская** вобласць), **Мікалаеўск-на-Амуры, а не Нікалаеў, Нікалаеўск-на-Амуры**, як раіць слоўнік.

У зборніку «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959) сцвярджаецца:

«...Прыстаўное **в** пішацца:

...У сярэдзіне наступных слоў перад **у: павук, цівун** і ў словах, вытворных ад іх: **павуцінне, павучок** і інш., а таксама ў некаторых уласных імёнах, напрыклад: **Навум, Матэвуш, Навуменка, Матэвушаў, Тадэвуш.**

...У сярэдзіне некаторых слоў перад націскным **о: ніводзін, Лявон, Радзівон, Ларывон».**

Усё здаецца зразумелым. Калі ж пачынаеш чытаць слоўнік, дык галава ходзіць кругам (а як яно дзецям!): раіцца пісаць **Астраумай, Кастаусаў, Ляонаў, Макраусаў** (але: **Чавусы, Чавускі**).

А чаму ў слоўніку ў вядомых прозвішчах і імёнах **Пестэль, Трэнёў, Чэркасаў, Тэрэза** захоўваецца ненацісковае **э**, а ў назве ракі **Церак**—не, хоць гэта назва і неславянскага паходжання? Не зусім удала гучаць па-беларуску імёны **Гаўрыіл, Данііл, Іларыён** і г. д., і іх, магчыма, не абавязкова было ўключаць у слоўнік.

Чамусьці апушчаны такія імёны, як **Фэлікс, Юзэфа**, напісанне якіх да гэтага часу блытаюць (пішуць **Фелікс, Юзефа**, хоць так ніхто не гаворыць). Варта было б паболын уключыць імён, прозвішчаў і геаграфічных назваў іншых славянскіх народаў, накшталт **Юзаф, Чанстахова, Рагіна, Трыфўнавіч** і г. д., каб не было разнабою ў іх напісанні (пішуць жа дагэтуль і так: **Юзэф, Чэнстахова, Рэгіна, Трыфуновіч** (югаслаўскае прозвішча) і г. д.

Не ўсё добра з напісаннем **д, т** у іншамоўных словах і геаграфічных назвах. У «Руска-беларускім слоўніку» (1953) пішацца, напрыклад, **Тыроль**, а ў цяперашнім «Арфаграфічным слоўніку» — **Ціроль**, у «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959) — **Сардынія**, а ў тым жа арфаграфічным слоўніку — **Сардзінія.** Незразумела таксама, чаму прозвішчы і геаграфічныя назвы неславянскага паходжання пішуцца паразнаму: **Дзікенс — Захарыядыс, Баграціён—Эндыкот, Марцініка — Тэмза** і г. д. Усё гэта, на маю думку, вынік досыць такі туманнай фармулёўкі правіла: «У імёнах, прозвішчах і геаграфічных назвах дз, ц або д, т. пішуцца ў залежнасці ад беларускага літаратурнага вымаўлення...». Здаецца, няма больш простага правіла. Але ўся цяжкасць менавіта ў гэтай прастаце. Хіба можа вучань (ды і не ўсякаму дарасламу гэта па сіле) разабрацца ў такім правіле?

Добра сфармуляваны ва ўступнай частцы «Арфаграфічнага слоўніка» параграфы 73 і 74 — пра канчаткі назоўнікаў другога скланення мужчынскага роду ў родным склоне адзіночнага ліку. Тым не менш, як зазначае І. Саковіч у сваім артыкуле, сапраўды не было ніякай неабходнасці рабіць выключэнне для чатырох назоўнікаў—**камунізма, сацыялізма, марксізма, ленінізма.** Гэта ў нейкай ступені нагадвае старое правіла пра так званыя інтэрнацыянальна-рэвалюцыйныя словы, дзе, як вядома, без ніякай патрэбы захоўваліся ненацісковыя **э** і **о.** Вельмі шкада, што ў слоўніку прапушчаны такія патрэбныя словы, як **жанр, этап, твор, тур, сюжэт, цыкл, турнір.** У «Руска-беларускім слоўніку» (1953) канчаткі роднага склону гэтых слоў, мне здаецца, пададзены далёка не дакладна **(жанра, этапа, твора, тура, цыкла, турніру).** Тура і турніру! Сапраўды, ёсць над чым падумаць. Вось чаму трэба было ўключыць гэтыя словы ў «Арфаграфічны слоўнік». Незразумела, напрыклад, чаму ў «Арфаграфічным слоўніку» раяць пісаць **сезона, але перыяду; рэйду, але рэкорда;** чаму **берагу** (бераг—гэта ж не разумовае, а хутчэй прадметнае паняцце! Дарэчы «Руска-беларускі слоўнік» раіць пісаць **берага), балета** (у «Руска-беларускім слоўніку»—**балету), вобраза?** У напісанне гэтых слоў трэба было б унесці нейкую яснасць. Калі словы абазначаюць разумовыя (непрадметныя) паняцці, дык і пісаць іх трэба з канчаткам—**у (туру, жанру, вобразу, чэмпіянату** і г. д.).

Наконт складаных слоў. Як зазначае І. Саковіч, вучням, ды і не толькі ім, цяжка ўцяміць, чаму мы пішам **паліграфія, паліклініка,** але **поліклінічны, палітэхнікум,** але **політэхнічны** і г. д. Відаць, трэба прыняць нешта адно, як гэта зрабілі з **«паў-», «поў-»,** са словамі **фота, мота, проці, што (паўночны, поўнач, фотакопія, мотакрос, процідзеянне, штодзённа).**

Тое ж хацелася б сказаць наконт слова **вада** і вытворных ад яго. Калі мы гаворым **вадавоз, вадаспад,** дык гэта зусім натуральна. А вымавіць словы **водапровад, водаправодчых** — проста язык не паварочваецца. Не дапамог «Арфаграфічны слоўнік» і ў напісанні некаторых указальных займеннікаў. Як усё ж такі пісаць: **гэта** практыкаванне ці **гэтае** практыкаванне, **гэту** кнігу ці **гэтую** кнігу? Вось парада мною «Падручнік беларускай мовы» (частка 1) М. І. Жыркевіча для 5 і 6 класаў сярэдняй школы. На стар 106 чытаем: «У другім сказе займеннік **стольк**і ўказвае на колькасць прадметаў, але не называе **гэтую** колькасць); на стар. 109: **«гэта** практыкаванне»; на стар. 112: «Абы-каму **гэту** справу даручыць нельга»; на стар. 113: «...Часамі, калі ўздымалася бура, **гэтая** песня пераходзіла ў злосныя выццё...» Вось і разбярыся вучань пасля гэтага ў правільнасці напісання названых займеннікаў!..

Несумненна, што новы «Арфаграфічны слоўнік» М. Судніка і М. Лобана з'явіцца добрым дапаможнікам як для тых, хто толькі вывучае беларускую мову, так і для ўсіх, хто будзе карыстацца ім як даведнікам пры напісанні найбольш складаных у арфаграфічных адносінах слоў. Шырокае абмеркаванне ў друку гэтага слоўніка дапаможа ўдасканаленню некаторых спрэчных момантаў у напісанні слоў.

В. КРАСОЎСКІ.

Падзеі. Факты. Навіны

Новую працу — п'есу «Шляхі-дарогі» Я. Ялунера — паказаў гледачам Багушэўскі народны тэатр. У спектаклі заняты самадзейныя артысты — А. Пазнякоў, Р. Фядура, Л. Нахмановіч, А. Гарбачоў, Р. Пучкова, В. Ермік, А. Кузняцова і інш. Спектакль пастаўлены артысткай Народнага тэатра Р. Сарочкінай, мастак А. Бяляўскі.

Л. ГРЫШАНАЎ.

* * *

У Брэсцкім педінстытуце адбыўся дыспут па кнізе Васіля Быкава «Жураўліны крык». Студэнты Паталкоў, Хаткевіч, Доліч і інш. выказалі свае заўвагі. У дыспуце прыняў удзел аўтар.

С. САЙКО.

* * *

Жытканіцкае раённае аддзяленне Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў сумесна з аддзелам культуры арганізавалі лекторый для бацькоў, які працаваў са снежня 1960 г. па сакавік г. г.

Былі прачытаны лекцыі «Аб камуністычным выхаванні дзяцей у сям'і і ў школе», «Аб рэжыме дня школьніка», «Аб атэістычным выхаванні дзяцей», «Аб працоўным выхаванні дзяцей у сям'і і ў школе», «Маральнае выхаванне дзяцей у сям'і і школе».

У маі пры раённым Доме культуры пачне працаваць лекторый культуры.

Э. ГАЛУБІЦКІ.

* * *

Звыш ста выступленняў у гарадах РСФСР далі ўдзельнікі канцэртнай брыгады Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У складзе брыгады — канферансье М. Зорын, спевакі Т. Ванэцян, Г. Федчык, В. Вуячыч, артысты балету В. Сухачоў і А. Качура, лаўрэат Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў цымбаліст М. Шмелькін, акрабаты М. Фаменка і Д. Зайцаў, піяністка П. Ханіс, артыст арыгінальнага жанра Г. Ермаловіч (палітсатыра ў малюнках).

Беларускім выканаўцам апладзіравалі працоўныя Масквы, Тулы, Бранска, Смаленска, Калінінграда.

АФАРМЛЕННЕ КНІГІ— НЕ РАМЯСТВО

Чамусьці не прынята рэцэнзаваць працу нашых мастакоў у галіне кніжнай графікі. У рэцэнзіях на тую ці іншую кнігу рэдка гаворыцца аб мастацкім афармленні выдання, а мастацтвазнаўцы ў сваіх артыкулах пераважна разглядаюць толькі тэматычныя карціны, скульптуру і іншыя творы так званых «буйных» жанраў.

А між тым, пра якасць мастацкага афармлення кніг варта гаварыць шырока, бо не заўсёды яна высокая.

У 1960 г. рэдакцыя мастацкай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР выпусціла звыш 100 назваў кніг розных жанраў. Разглядаючы мастацкае афармленне па разделах тэматычнага плана, трэба адзначыць, што найбольш пашанцавала раздзелу «Зборы твораў» і «Выбраныя творы». І гэта зразумела. Па традыцыі такія кнігі павінны быць вытрыманы ў сціплай, строгай манеры. Гэтага ж патрабуюць спецыяльныя пераплётныя матэрыялы: калянкор і лідзерын. Удала афармлены збор твораў у двух тамах Я. Брыля (мастак В. Харэўскі), аднатомнік Хв. Шыклера (мастак А. Ліс-ічнікаў), зборнікі выбраных твораў М. Нікановіча (мастак Г. Клікушын), Ю. Лявоннага (мастак М. Шырокаў). Нядрэнныя вокладкі ў двухтомніку М. Лужаніна (мастак А. Ліс-ічнікаў), у «Вершах і паэмах» Я. Пушчы (мастак М. Бельскі). Праўда, у апошніх дзвюх кнігах мастакамі не выкарыстаны ўсе магчымасці прыгожага шэрага калянкору, таму афармленне не вылучаецца арыгінальным вырашэннем. Зусім не чытаецца цісненне блінтам на вокладках да кніг А. Русака «Толькі з табою» (мастак А. Лісічнікаў), М. Гарэцкага «Выбранае» (мастак І. Карпіновіч).

Умоўнае шрыфтавое афармленне характэрна для новых кніг нашых крытыкаў і літаратуразнаўцаў. З добрым мастацкім густам афармлены вокладкі кніг Ул. Юрэвіча «Слова і вобраз» (мастак С. Русак), А. Кучара «Аб мастацкай прозе» (мастак Л. Прагін), Я. Казекі «Беларуская байка» (мастак М. Шырокаў). Менш удалая вокладка да кнігі «Старонкі братняй дружбы» С. Александровіча (мастак А. Лісічнікаў).

Арыгінальныя творы беларускіх празаікаў і паэтаў, пераклады з арыгінала, а таксама асобныя творы класікаў выдаюцца пераважна ў пераплёце № 5 і з мяккай вокладкай, што патрабуе ад мастакоў сюжэтных танавых і шматколерных малюнкаў, завершанай кампазіцыі і адзінства ўсіх кампанентаў афармлення (вокладка, тытул, шмуцтытулы, малюнкі, застаўкі, канцоўкі). Да ліку лепшых работ графікаў у мінулым годзе трэба аднесці афармленне А. Кашкурэвічам рамана К. Чорнага «Трэцяе пакаленне», Ю. Пучынскім рамана І. Шамякіна «Глыбокая плынь», С. Спіцыным рамана А. Міронава «Толькі мора наўкол», І. Немагаем аповесці Зм. Бядулі «Салавей», літоўскім мастаком С. Красаўскасам рамана А. Венцлавы «Дзень нараджэння». Вельмі прыемна, што ўпершыню пасля доўгага перапынку мы бачым у кнігах Дзяржаўнага выдавецтва БССР лінагравюры (А. Кашкурэвіч і І. Немагай), гравюры на дрэве (С. Красаўскас).

Астатнія выданні не вылучаюцца такім адзінствам усіх элементаў афармлення. Так, калі мастаку С. Рамануву больш-менш удаліся тытул, шмуцтытулы і малюнкі да рамана А. Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» і тэтралогіі І. Шамякіна «Трывожнае шчасце», дык вокладкі гэтых кніг зроблены безгустоўна, на вельмі нізкім узроўні, да таго ж і дрэнна надрукаваны. Лепшай магла б быць і вокладка ўвогуле някепска афармленай аповесці Р. Сабаленкі «Каралінцы» (мастак І. Някрасаў). Нават выключнае паліграфічнае выкананне не выратавала б вельмі няўдалай вокладкі Г. Віткоўскага да рамана Ул. Дадзіёмава «Над Нёманам».

Слабае выкананне вокладкі — тыповы недахоп працы многіх мастакоў-графікаў. Гэта псуе, напрыклад, ураджанне ад афармлення П. Калініным аповесці Н. Навасёлавай «Справа даручасца вам» і рамана К. Шпей-Красікава «Шумелі Сяны». У апошнім цікава і арыгінальна зроблены застаўкі, але зноў-такі даволі прымітыўнае вырашэнне вокладкі. У афармленні кнігі Г. Шчарбатава «Лясны фронт» (мастак А. Кандрусевіч) бачна перанасычанасць сюжэтных элементаў на тытуле і шмуцтытулах, што вядзе да безгустоўнасці. Неарыгінальная і вокладка да гэтай кніжкі, дзе (у які ўжо раз!) намаляваны барадатыя дзяды-партызаны. Наогул, трэба адзначыць, што ў апошні час назіраецца пэўная аднастайнасць у афармленні літаратуры на партызанскую тэматыку, у мастакоў выпрацоўваецца шаблон, штамп.

Чамусьці колькасць кніг, якія поўнасцю ілюструюцца, у Дзяржаўным выдавецтве БССР штогод скарачаецца. На нашу думку, аддзел мастацкага афармлення і галоўная рэдактура выдавецтва павінны прыцягваць да ўдзелу ў планаванні афармлення на кожны год прадстаўнікоў творчых секцый Саюза пісьменнікаў, а таксама ўсіх рэдактараў выдавецтва, якія прыкладна ведаюць ідэйна-мастацкую вартасць кожнай плануемай кнігі. Яны з улікам творчай асаблівасці аўтара маглі б параіць, якія элементы афармлення пажадана мець у той ці іншай кнізе. Тады, напрыклад, не было б запланавана дэталёвае афармленне слабай у мастацкіх адносінах аповесці М. Садковіча «Чалавек у тумане».

Вялікая колькасць кніг афармляецца па прынцыпу: вокладка плюс тытул. У асобных выпадках да гэтага далучаецца афармленне шмуцтытулаў, застаўак і канцовак. Дзяржаўнае выдавецтва БССР у апошні час смялей пачало выпускаць кнігі з супервокладкамі, праўда, пакуль што толькі да мяккіх вокладак. Не ўсё і тут на належным узроўні. Тое, што колькасць мастакоў, якія прыцягнуты да афармлення кніг, абмежавана, прыводзіць да непазбежных паўтораў, да страты патрабавальнасці.

Поспех афармлення той ці іншай кніжкі, дзе афармляюцца пераважна вокладка і тытул, залежыць ад таго, як мастак пранікне ў сутнасць рамана, апавядання або аповесці, як ён прачытае мастацкі твор.

Здольным, удумлівым графікам зарэкамендаваў сябе А. Кашкурэвіч. Вышэй гаварылася ўжо аб яго цікавых лінагравюрах да рамана К. Чорнага «Трэцяе пакаленне». У мінулым годзе мастак працаваў у асноўным над афармленнем перакладаў. Адна з лепшых яго работ — афармленне кнігі П. і В. Бояраў «Закаханыя». Добры мастацкі густ, веданне літаратурнага матэрыялу праяўляецца ў элементах афармлення А. Кашкурэвічам рамана М. Крно «Я вярнуся жывы» і А. Сціля «Любіць будзем заўтра». Але неабходна папярэдзіць мастака ад некрытычнага ўспрымання заходняга стылю ў кніжнай графіцы. Не ўдалася А. Кашкурэвічу вокладка да зборніка апавяданняў Ус. Краўчанкі «Зорка Венера». Тут безгустоўны падбор фарбаў (аж шэсць на мяккай вокладцы маленькага фармату), прымітыўны сюжэт з тварам дзяўчыны, які, дарэчы, паўтараецца на вокладках мінулага года каля сямі разоў (вокладкі Г. Клікушына да кнігі А. Марціновіча «Надзея» і да зборніка Д. Уксусава «Ранні ветрык», І. Някрасава да аповесці Р. Сабаленкі «Каралінцы», Б. Аракчэева да кнігі А. Рылько «Ты прыгожая, Арынка»).

У актыве мастака Г. Клікушына, таксама ёсць нямала добрых, удалых графічных работ. Г. Клікушын шукае свае выяўленчыя сродкі, свой стыль,—і гэта добра. Але ў апошні час у яго рабоце заўважаюцца шаблон, прымітыў, а то і яўная халтура. З кніг мінулага года да актыву мастака можна далучыць бадай што толькі вокладку да кнігі М. Нікановіча «Летнім днём». Усё астатняе зроблена ім на нізкім узроўні.

Г. Клікушын афармляе чамусьці вельмі многа кніг, прыкладна ў тры разы больш за іншых мастакоў. Так, з 18 назваў кніг паэзіі ў 1960 г. восем афармляў Г. Клікушын. Вельмі падобныя адна да адной кампазіцыйна вокладкі гэтага мастака да кніг «На грэбнях хваль» С. Гаўрусёва і «Сонечны дождж» І. Сіпакова, «Ранішнія росы» Ул. Ляпёшкіна і «Сэрца спявае» А. Астапенкі. Зборнік вершаў Ул. Нядзведскага «Запрашэнне» афармлены Г. Клікушыным як карыс на сельскагаспадарчую тэматыку. Неахайна зроблена ім жа супервокладка да зборніка Н. Гілевіча «Неспакой», а вокладка афармлена вельмі прымітыўна. На вокладках Г. Клікушына знаходзім альбомныя старасвецкія кветачкі (вышэй памянёныя зборнікі А. Астапенкі і Ул. Ляпёшкіна), неахайна выпісаны шрыфт, безгустоўны трохколерны фон, прымітыўны малюнак кніг М. Гроднева «За бацькоўскім парогам», Т. Кляшторнага «Залатое вязьмо», Ул. Караткевіча «Вячэрнія ветразі», а зборнік апавяданняў «Млечны шлях» В. Адамчыка афармлены Г. Клікушыным, як карабок

(Заканчэнне на 4-й стар.).

У Гомелі адкрыўся шырокаэкранны кінатэатр «Кастрычнік».
Фота Ф. Раманава.
Фотахроніка БЕЛТА.

Уражанне застаецца прыемнае

Я прачытаў першую кнігу журналіста Валянціна Панамарова «На хвалях жыцця» *). Радасна адкрыць для сябе яшчэ аднаго здольнага пісьменніка.

Назва кнігі спачатку крыху насцярожвае, бо аддае і літаратуршчынай і штампам. Але, прачытаўшы кнігу, пераконваешся, што аўтар ведае жыццё, праўдзіва і пераканальна адлюстроўвае характэрныя рысы яго. Усе нарысы тут — дакументальныя. Большасць іх вызначаецца добрымі мастацкімі вартасцямі.

Кепскі нарыс — гэта аднадзёнка. В. Панамароў палічыў магчымым праз многія гады пасля надрукавання некаторых сваіх нарысаў уключыць іх у кнігу. Значыцца, аўтар пераконаны, што нарысы і сёння не страцілі грамадскага гучання, што яны як літаратурныя творы маюць пэўныя мастацкія вартасці. Нельга сказаць, каб аўтару і рэдактару зборніка бракавала самакрытычнасці і патрабавальнасці.

Напісаны ў 1955 г. пад непасрэдным уражаннем ад паездкі на цаліну, нарыс «Кузьміч» і сёння, калі пачаўся новы этап у асваенні цалінных зямель не страціў актуальнасці. Аўтар на фактычным, дакументальным матэрыяле стварае выразныя мастацкія вобразы, абагульненыя тыпы і характары людзей. Сакавіта выпісаны вобраз Кузьміча — галоўнага героя нарыса. У яго — адметны характар, дасціпная гаворка, толькі яму ўласцівыя звычкі, сваё стаўленне да людзей: мяккасць, душэўнасць да блізкіх ягонаму сэрцу, і непрымірымасць, сарказм да тых, каго сэрца ўзненавідзела. Кузьміч і суровы і на дзіва паэтычны; гэта жывы чалавек, які сваёй адданасцю справе, непрымірымасцю да казёншчыны, подласці нясе ў сабе рысы перадавога чалавека нашага часу. Поўная супрацьлегласць яму — Гарлач, чалавек неразумны, некультурны, грубы. В. Панамароў не канстатуе, не дэкларуе гэтыя якасці Гарлача, а трапна, «эрыма», як кажуць, раскрывае іх:

«Гарлач карціна ўстаў, зняў акуляры стомленым рухам левай рукі і, зрабіўшы афіцыйны выгляд і перачакаўшы нейкі час, як гэта робяць вопытныя прамоўцы, задуменна падняў галаву, нібы стаяў перад тысячнай аўдыторыяй. Загаварыў спачатку павольна, ціха і нізка, а потым, адкашляўшыся, увайшоў у голас:

— Таварышы! Мы тут, як кажуць, параіліся і вырашылі абмеркаваць у найбольш шырокім коле нашага, як кажуць, грамадскага і вытворчага актыву...»

Саркастычная атэстацыя Гарлача падмацоўваецца новымі дэталямі: яго «красамоўствам», у якім мала розуму, сэнсу, яго брыдкімі ўчынкамі. Увачавідкі жывы, рэальны, дакументальны, калі можна так сказаць, Гарлач ператвараецца ў мастацкі вобраз. Гэта ўжо не Гарлач, а гарлачы, тыя, каго жыццё адкінула ўбок, каб яны не перашкаджалі нашай хадзе ўперад. У тым і вартасць нарыса «Кузьміч», што перамога новага, прагрэсіўнага тут не дэкларавана, а «прааналізавана» мастацкімі сродкамі.

Тут міжволі прыгадваюцца размовы пра «дозу» станоўчага і адмоўнага ў мастацкім творы. У нарысе «Кузьміч» няма гэтай «дазіроўкі»: і станоўчы і адмоўны героі выпісаны аднолькава моцна, мы выразна бачым і Кузьміча і Гарлача, востра адчуваем нялёгкую барацьбу, якую вядзе Кузьміч. Аўтар не «прыпудрывае» станоўчага героя і не згладжвае вуглоў пры абмалёўцы адмоўнага. Не, не абыякавым чалавекам выпісаны вобразы гэтых людзей. Мы адчуваем аўтарскую пазіцыю, яго сімпатыі і антыпатыі — ён з любоўю, прыхільна ставіцца да Кузьміча, а Гарлача—ненавідзіць.

І яшчэ пра адно хочацца сказаць—пра паэтычнасць пейзажных замалёвак. Вось першая з іх, якая трапіла на вочы:

«Ездзіць з інжынерам (Кузьмічом. — **Ул. Д.**) была адна асалода. А ў гэтую раніцу да гэтай асалоды прыбаўлялася незвычайная, скупая, але тым і кранальная прыгажосць вераснёўскага паўночна-паўладарскага стэпу, бясконцая роўнядзь якога то тут, то там ажыўлялася мудрагеліста раскіданымі колкамі. Уласна кажучы, у гэтых частых, не падобных адзін на другі бярозавых гаях, расфарбаваных стракатай каляровасцю, у лісці, што спявала свае апошнія песні, і заключалася ўся прыгажосць стэпу, які сам па сабе, пакрыты жухлай травой, быў сумны і непрывабны, як старая шкура вярблюда.

А паветра! Не ўтрымаеш — спынішся, пройдзеш па звонкіх лісцях у глыбіню гаю, нібы ў казачны палац з мармуру, золата і сонца, і п'еш — не нап'ешся сухой свежасці бярэзніку. Прыслухаешся да таемнага шэпту лесу і раптам скалянешся ад шуму: узляцеў касач, потым другі, трэці — цэлая чарада. Хвіліна — і зноў усё ціха, хораша...»

Запамінаецца нарыс «Вакол Еўропы». Тут багата добрых дэталей, трапных параўнанняў. Вочы савецкага чалавека бачаць у «капіталістычным раі» тое, што імкнуцца замаскаваць гаспадары гэтага «раю».

Шмат творчых знаходак і на старонках іншых нарысаў. Есць, бясспрэчна, і недахопы. Мала чаго новага расказаў нам аўтар пра Кірылу Арлоўскага, пра юных мсціўцаў—обальскіх падпольшчыкаў (нарысы В. Панамарова слабейшыя ў параўнанні з вядомымі літаратурнымі творамі пра гэтых людзей, і таму, відаць, не варта было б уключаць іх у зборнік). Можна папракнуць аўтара і за павярхоўнасць нарыса «На хвалях жыцця». Але я не пішу рэцэнзію з падрабязным аналізам вартасцей і недахопаў усіх нарысаў зборніка В. Панамарова. Мне проста хацелася падзяліцца першым уражаннем ад гэтай, на мой погляд, цікавай і карыснай кнігі.

Ул. ДАДЗІЁМАЎ.

*) **В. Панамароў.** На хвалях жыцця. Белдзяржвыдавецтва. Мінск. 1961.

Шматгранны талент

Талент Аскара Пятровіча Марыкса шматгранны, а творчы дыяпазон шырокі. Ён вядомы як тэатральны дэкаратар з тонкім эстэтычным густам і высокай мастацкай культурай. Філасофская драма і вясёлы вадэвіль, трагедыя і камедыйныя пастаноўкі, бытавая п'еса і гераіка рэвалюцыйных падзей, гістарычныя палотны і сучасная тэматыка, дзіцячыя казкі і гістарычная дакументальнасць, оперныя і балетныя творы ставіліся на сцэне ў афармленні Марыкса.

Мастак-дэкаратар прайшоў доўгі і складаны шлях. За 40 год сваёй творчай дзейнасці ў Беларусі ім аформлена больш 200 спектакляў. Яны адлюстроўвалі розныя гістарычныя эпохі, што сведчыць аб веданні мастаком гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў.

А. Марыкс атрымаў адукацыю ў Пражскай Акадэміі мастацтваў. Фармаванне яго светапогляду як мастака, чалавека і грамадзяніна праходзіла ў бурныя дні Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

У напружаныя дні грамадзянскай вайны А. Марыкс быў інструктарам Палітаддзела 5-й арміі. У 1922 г. ён пачаў працаваць у Першым дзяржаўным тэатры Беларусі (цяпер Тэатр імя Янкі Купалы). Гэтаму калектыву ён аддаў многа год, тут канчаткова ўсталявалася яго цікавасць да жыцця, традыцый, культурнай спадчыны беларускага народа.

Значны ўплыў на эстэтычныя погляды дэкаратара зрабіў выдатны рэжысёр, педагог і драматург, мастацкі кіраўнік тэатра Я. Міровіч, з якім у Марыкса на ўсё жыццё ўстанавілася цесная садружнасць.

Ужо ў першых самастойных работах па афармленню спектакляў «Машэка» і «Кастусь Каліноўскі» вызначыўся творчы напрамак дзейнасці мастака: рэалізм, гістарычная праўдзівасць, гераіка-рамантычная прыўзнятасць вобразнага ладу, эмацыянальная насычанасць дэкарацый.

Як і кожны таленавіты майстар, А. Марыкс разумеў, што ў мастацтве нельга сказаць новае слова без ведання народнай творчасці, без вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры. Замалёўкі архітэктурных помнікаў, народных касцюмаў, тыповага, характэрнага ў беларускай прыродзе дапамагалі мастаку ўбачыць нацыянальныя асаблівасці жыцця народа і адлюстраваць іх у афармленні твораў беларускай драматургіі.

У спектаклі «Кастусь Каліноўскі» А. Марыкс паказаў глыбокае адчуванне гераікі вызваленчай барацьбы беларускага народа. Мастак стварыў тут вобразнае псіхалагічнае асяроддзе дзеяння. Псіхалагізм сцэнічнага афармлення — якасць, якая адрознівае творчасць А. Марыкса ад так званага «наватарства» дэкаратараў умоўнага напрамку, якое пачало паступова запаланяць пад канец 20-х гадоў тэатры Беларусі.

У гэты час у мастацтве ішла складаная і напружаная ідэйна-творчая барацьба.

Канструктывісты, якія называлі сваё наватарства «ўмоўным рэалізмам», фармалісты ўсіх масцей, «пралеткультаўцы», а ў пачатку 30-х гг. рапаўцы стварылі невыносныя абставіны для работы мастакоў-рэалістаў. Прыкрываючыся фразамі аб новым пралетарскім мастацтве, адстайваючы платформу «Уновіса» (так званых устанавіцеляў новага мастацтва), ідэолагам якога быў К. Малевіч, яны разбуралі выяўленча-пластычную аснову афармлення спектакля, яго змястоўную рэалістычную форму. На рубяжы новага дзесяцігоддзя ў тэатрах рэспублікі былі закрыты ўсе дэкаратыўныя майстэрні, разагнаны мастакі-дэкаратары. У атмасферы панавання гастралёраў-фармалістаў не мог працаваць далей у беларускім тэатры жывапісец К. Ціханаў, вучань Каровіна. Вымушаны былі пакінуць тэатр і яго заснавальнікі — А. Марыкс і Я. Міровіч. І толькі пасля трохгадовай работы ў тэатрах Бранска, Бежыц, Горкага беларускі мастак зноў вярнуўся ў Мінск.

З 1943 г. пачынаецца новы этап у творчай дзейнасці А. Марыкса. Ён працуе амаль ва ўсіх тэатрах рэспублікі.

На сцэне адраджаецца на больш сталай аснове аб'ёмна-жывапісная дэкарацыя, яе эмацыянальная вобразнасць, выціснутая ў свой час абстрактным канструктывізмам.

У гэты самы плённы час дзейнасці А. Марыкса паглыбляецца змястоўнасць і вобразная выразнасць яго творчасці, культура жывапіснага эскіза.

Дэкарацыі афармленых мастаком спектакляў «Салавей» Зм. Бядулі, «Чалавек з ружжом» М. Пагодзіна, «Цудоўная дудка» В. Вольскага займаюць цэнтральнае месца ў гісторыі развіцця беларускага тэатральна-дэкаратыўнага мастацтва 30-х гадоў. Гістарычная праўдзівасць, вобразная выразнасць, стылістычная яснасць, якія арганічна вынікаюць з самой прыроды драматургічнага матэрыялу, і разам з тым незвычайная прастата сродкаў адлюстравання — такія асаблівасці гэтых твораў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны А. Марыкс працуе галоўным мастаком Тэатра імя Я. Коласа, аддае ўсе свае сілы стварэнню спектакляў, якія ўзнімалі савецкіх людзей на гераічныя подзвігі ў тыле і на фронце.

У пасляваенны перыяд мастак прымае самы дзейны ўдзел у творчым жыцці ўсіх тэатральных калектываў рэспублікі. У яго афармленні ставяцца п'есы савецкіх пісьменнікаў, класікаў рускай і сусветнай драматургіі: «Рускае пытанне», «Шчасце», «Дзядзя Ваня», «Абрыў», «Ягор Булычоў», «Фауст», «Разбойнікі», «Марыя Сцюарт» і рад іншых.

Сіла творчасці А. Марыкса — у стрыманай прастаце, ва ўменні ясна і праўдзіва раскрыць ідэйна-мастацкі змест п'есы. Веданне жыцця, тэатра, тэхнікі сцэны, рэалістычнае майстэрства дазволілі яму стварыць дзесяткі дэкарацый, якія атрымалі высокую ацэнку савецкага гледача.

Шматгранны вопыт старэйшага тэатральнага жывапісца, вынік доўгіх гадоў творчых пошукаў — вельмі каштоўны для кожнага дзеяча сцэнічнага мастацтва.

З 1949 года А. Марыкс працуе ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, рыхтуе новую змену тэатральных мастакоў.

Заслугі мастака ў развіцці беларускага мастацтва не раз высока ацэньваліся ўрадам. Ён быў узнагароджаны граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалямі і ордэнам «Знак пашаны». У 1945 г. яму было прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча мастацтва БССР.

У дзень сямідзесяцігоддзя і пяцідзесяцігоддзя творчай дзейнасці Аскару Пятровічу прысвоена ганаровае званне народнага мастака БССР.

У А. Марыкса многа сіл і энергіі. Ён перажывае сваю другую маладосць, радуючыся вялікаму размаху будаўніцтва новага жыцця, поспехам Савецкай дзяржавы, цвёрдаму поступу таленавітай моладзі, якая нясе на сцэну бадзёрае, звонкае, яркае, чалавечае.

П. МАСЛЕНІКАЎ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

На здымку: А. Марыкс сярод студэнтаў Тэатральна-мастацкага інстытута.

Цёплыя веснавыя дні стаяць у Брэсце. Зазеляненелі вуліцы і скверы горада, у садах зацвітаюць чарэшні, вішні, абрыкосы. На абласной станцыі юных натуралістаў расце малады сад, у ім сто дрэў.

На здымку: кіраўнік гуртка юных садоўнікаў Даліна Мікалаеўна **Каверзнікава** (злева) і вучаніца шостага класа 7-й школы Аня **Калупановіч** ля квітнеючага абрыкоса. Фота **М. Мінковіча.**

ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ВЫСТУПІЛА ГАЗЕТА

Справа пойдзе на лад

Начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення культуры Ю. Міхневіч і старшыня Старадарожскага райвыканкома Г. Лебедзеў паведамляюць, што факты, пададзеныя ў артыкуле «За частаколам лічбаў» (10 лютага 1961 г.) у асноўным пацвердзіліся.

У Старадарожскі раён выязджалі работнікі абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. Яны праверылі работу раённай, сямі сельскіх, трох клубных, трох школьных і некаторых іншых бібліятэк.

Устаноўлена, што ў рабоце бібліятэк Старадарожскага раёна ёсць сур'ёзныя недахопы. Нездавальняюча арганізавана выкананне пастаноў ЦК КПСС і ЦК КПБ па паляпшэнню бібліятэчнай справы ў краіне і рэспубліцы. Слаба вядзецца прапаганда сельскагаспадарчай літаратуры, дрэнна працуюць многія калгасныя бібліятэкі, мала аддаецца ўвагі паляпшэнню іх матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Вынікі праверкі работы бібліятэк раёна былі абмеркаваны на пасяджэнні выканкома райсавета. Выканком наметаў рад мерапрыемстваў, якія павінны палепшыць іх работу. Галоўная ўвага звернута на выкананне сацыялістычных абавязацельстваў работнікаў культасветустаноў на 1961 год. У прыватнасці ставіцца задача, каб бібліятэчную кнігу чыталі ў кожнай сям'і рабочага, калгасніка і служачага, усе дзеці школьнага ўзросту. Загадчыку аддзела культуры А. Вечару і загадчыцы раённай бібліятэкі В. Круноўскай прапанавана палепшыць якасць камплектавання бібліятэк новай літаратурай, а таксама масавую работу сярод чытачоў, узмацніць метадычную дапамогу сельскім, клубным, калгасным і школьным бібліятэкам.

Цяпер ва ўсіх бібліятэках раёна разгортваецца нагляднай агітацыя па прапагандзе рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС і дастойнай сустрэчы XXII з'езду КПСС. Вялікая ўвага аддаецца распаўсюджванню вопыту перадавікоў калгаснай вытворчасці.

Сёлета ў пяці сельскіх і клубных бібліятэках будзе ўведзены адкрыты доступ чытачоў да кніжных фондаў. З 1 ліпеня адкрываецца бібліятэка ў Палажэвіцкім сельсавеце. Горкаўская і Цярэбуцкая сельскія бібліятэкі атрымаюць добраўпарадкаваныя памяшканні. У некаторых бібліятэках і клубах будзе зроблены капітальны рамонт. Раённы аддзел культуры набыў сталы, шафы, крэслы, заказаны стэлажы для сельскіх і клубных бібліятэк.

Горкаўская сельская бібліятэка (загадчыца Е. Хмялёва) у мінулым годзе была пераведзена з вёскі Паськава Горка ў вёску Горка ў сувязі з тым, што апошняя з'яўляецца цэнтрам буйной паляводчай брыгады, у якой жыве 546 чалавек. Апрача таго, тут будуецца брыгадны калгасны клуб, у якім прадугледжаны для Горкаўскай сельскай бібліятэкі два пакоі (для абанементу і чытальнай залы). Праўда, пакуль што гэтая бібліятэка часова знаходзіцца ў непрыстасаваным памяшканні.

Аддзел культуры ў сакавіку правёў чатырохдзённы семінар работнікаў культуры раёна, на якім з дакладам аб задачах работнікаў культасветустаноў па прапагандзе рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС і дастойнай сустрэчы XXII з'езду партыі выступіў сакратар райкома КПБ А. Ярохін. Удзельнікі семінара абавязаліся да адкрыцця XXII з'езду КПСС дамагчыся, каб у кожнай сям'і рабочага, калгасніка і служачага чыталі бібліятэчную кнігу, змагацца за званне «Бібліятэка выдатнай працы».

У красавіку—маі будзе праведзены семінар бібліятэкараў раёна з удзелам работнікаў абласной бібліятэкі.

У прыгожым горадзе—адпачываць культурна

ПРЫГАЖОСЦЬ ПАТРЭБНА ЎСІМ

Вілейка — чысты, утульны горадок. Яго шырокія брукаваныя вуліцы крута спускаюцца да рэчкі з прыгожай назвай Вілія. Быстрая, празрыстая, паўнаводная ў гэтыя веснавыя дні рака ласкава абдымае гарадок. За рэчкаю, мякка асветленая сонцам, зелянее рунь, вільготна чарнее ворыва, крыху далей — густыя бярозавыя гаі, поўныя птушынага пошчаку, пералескі з духмянай прахаладай... І ўся гэтая прыгажосць тут, побач! Скончыў працу, і ты на ўлонні прыроды — чым гэта не курорт!

Добра жыць у такіх маляўнічых мясцінах! Таму жыхары Вілейкі ўсяляк стараюцца наблізіць прыроду да горада. Кожную вясну яны дапамагаюць маладзенькім ліпам, клёнам, бярозкам перасяліцца з лясоў на гарадскія вуліцы.

Хто садзіць дрэвы? Усе, ад вялікага да малога. Але, вядома, першыя — старыя і школьнікі. Прывозяць зялёных сяброў машыны прамысловых прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый.

Вось прыйшоў у горад грузавік з маладзенькімі бярозамі. Машыну тут жа акружае натоўп людзей. Дрэўцы разбіраюць у момант, кожнаму хочацца ўзяць больш. Ямкі выкапаны загадзя, цяпер пасадзіць дрэўца — справа дзвюх—трох хвілін. Ідзе своеасаблівае спаборніцтва. Хтосьці пасадзіў насупраць свайго дома дзесяць дрэў. «Што ж,—кажа сусед,—я пасаджу дваццаць!»

Расказваюць пра старога, які пасадзіў на сваёй вуліцы сто пятнаццаць дрэў.

— Дзесяць не прыняліся, — са смуткам сказаў ён, нібы гаворка ішла пра жывыя істоты.

Пладовыя дрэвы растуць у дварах амаль кожнага дома. Цікавасць да садоўніцтва такая вялікая, што на лекцыю «Догляд пладовага саду» сабралася людзей больш, чым мог змясціць клуб. З гэтай прычыны, а таксама для большай нагляднасці, другая частка лекцыі праходзіла ў садзе. Некаторыя слухачы былі ўзброены рыдлёўкамі, граблямі, садовымі нажніцамі, вучыліся саджаць дрэвы, дагледаць іх, рабіць прышчэпкі.

Я звярнуў увагу на тое, што многія жыхары капаюць рыдлёўкамі свае прысядзібныя ўчасткі.

— Што думаеце пасеяць? — спытаўся я ў адной цёткі. — Калі агуркі, дык, мабыць, ранавата.

— Пад кветкі зямельку рыхтую, — адказала жанчына.

Аказалася, што ўвесь свой участак ля дома яна адводзіць пад кветкі. Улетку ў яе двары пышна расцвітаюць мацыёла, настурцыя, флёксы, ляўконіі, пахучы тытунь, пад восень пышна квітнеюць вяргіні і астры.

— А як ваша прозвішча, магчыма, я назаву яго ў артыкуле, — сказаў я.

Жанчына сумелася, замахала рукамі.

— Што вы! Хіба я адна гэтым займаюся. У нас, у Вілейцы, кветкалюбаў не злічыць. Больш сціплага за мой кветнік, бадай, і няма. А вось калі вам гэта цікава, я дам вам адрас адной грамадзяначкі, яна ў нас вельмі знатная па кветках. Запішыце: Першамайская, 42. Гэта настаўніца Соф'я Мікалаеўна Зяленская. Калі б вы ведалі, якія ў яе бываюць нарцызы! А ружы — панюхаеш, галава закружыцца!

Соф'і Мікалаеўны, на жаль, не было дома. Але ад суседзяў я даведаўся, што настаўніца сапраўды вядома на ўсю акругу кветкавод. Між іншым, гэта яна першая ў горадзе прапанавала наладжваць кожны год у жніўні выстаўку кветак.

Такія людзі, як Соф'я Мікалаеўна, робяць аблічча горада цудоўным. Заслугоўвае ўдзячнасці іх імкненне зрабіць жыццё прыгажэйшым.

У горадзе зелена, утульна. На чысты тратуар пасаромеешся кінуць акурак, абгарэлую запалку, аўтобусны білет.

Амаль усе аднапавярховыя дамы ў Вілейцы пакрыты гладка выгабляванымі драніцамі, пафарбаванымі ў блакітны, сіні ці светлажоўты колер. Гэта ў спалучэнні з мноствам зеляніны робіць вуліцы святочна-прыгожымі.

ПРА ХЛЕБ НАДЗЁННЫ

Не адзінай прыгажосцю жыве чалавек. Патрэбен яму і хлеб надзённы. А хлеб у Вілейцы цудоўны. Ён пахучы, добра выпечаны, хрумсціць румяная скарыначка на зубах і спружыніць, калі націснуць на бохан далонню. Апроч трох гатункаў фармовачнага завод пачаў нядаўна выпякаць подавы хлеб.

А чаму, уласна, даводзіцца яшчэ гаварыць пра якасць хлеба? Ды таму, што ёсць у нас яшчэ гарады, дзе выпякаюць такі хлеб, што адзін выгляд яго наводзіць на сумныя думкі аб катарах і гастрытах. З'ясі яго і ўвесь дзень пакутуеш ад пякоткі. «Захоўваем норму прыпёку», — загадкава гавораць у такіх выпадках хлебапёкі. Вось дык штука! Атрымліваецца, што ў Вілейцы, у адрозненне, скажам, ад Крывічоў, дзе хлеб, мякка кажучы, няважны, нейкія асаблівыя, спрыяльныя нормы прыпёку...

Да хлеба, вядома, патрэбен прыварак. Які ён у Вілейцы? Падарожжа па прадуктовых магазінах пераконвае, што гандаль мяснымі, малочнымі і іншымі прадуктамі наладжаны добра. Прадаўцы ветлівыя, любяць дагадзіць, добра ведаюць сваю справу.

— Калі вам на суп, дык вазьміце вось гэты кавалачак з цукровай костачкай... Катлеты збіраецеся рабіць? Тады магу прапанаваць што-небудзь мякчэйшае.

Есць у горадзе і камісійны магазін, які спецыяльна гандлюе самымі разнастайнымі прадуктамі: вяндлінай, шынкамі, хатняй каўбасою. У некалькіх магазінах бойка ідзе гандаль малаком. Прадаўшчыцы ў беласнежных халатах працуюць хутка, старанна.

Адрамантаваць абутак у Вілейцы вельмі лёгка. Пасядзеў некалькі хвілін у крэсле, пачытаў газету ці паслухаў радыё, і вось ужо з майстэрні выходзіць майстар: «Атрымайце, калі ласка!».

На камбінаце бытавога абслугоўвання вы можаце пагаліцца, сфатаграфавацца, здаць адзенне ў хімчыстку.

Мне трэба было перазарадзіць плёнку ў апараце і я звярнуўся да фатографа камбіната.

У Вілейцы шыюць цудоўна. Праўда, чакаць даводзіцца доўга, іншы раз месяц, а то і паўтара. Заказчыкаў многа, краўцоў не хапае. Заказваюць не толькі гараджане, але і калгаснікі. Усім хочацца добра апранацца.

А вось каб памыцца ў лазні, трэба патраціць вельмі многа часу, іншы раз тры—чатыры гадзіны. У маленькай лазні вялікая чарга, чалавек сто не менш.

— Кажаце, лазня цеснаватая? — перапыталі мяне ў гаркамгасе.—Гэта нічога, план чалавекапамывак мы перавыконваем!

Што гэта за штука — «план чалавекапамывак»? А калі людзі хочуць мыцца, так сказаць, звыш плана?

Звярнуўся за тлумачэннем да старшыні гарсавета тав. Котава. Гэты не спасылаўся на план «чалавекапамывак». Проста сказаў:

— Так, лазня ў нас сапраўды маленькая. Пакуль што дабавім у тыдзень яшчэ адзін банны дзень. А хутка ў нас будзе новая, прасторная і добраўпарадкаваная лазня. Будаўніцтва яе вось-вось пачынаем. Што датычыць кравецкай майстэрні, дык мы гэтую справу таксама маем на ўвазе. Запросім яшчэ некалькі добрых майстроў, тады пашыць касцюм можна будзе за тыдзень.

«ПАДКІДНЫЯ ДУРНІ»

— Як вы адпачываеце? — гэтае пытанне я задаваў многім жыхарам Вілейкі.

— Дрэнна адпачываем! — чуўся адзін і той жа адказ.

Усюды расклеены афішы: танцы, танцы, танцы... Апроч гэтага «мерапрыемства» гарадскі Дом культуры амаль нічога не можа прапанаваць людзям, якія хацелі б і шукаюць культурнага адпачынку. І вось моладзі даводзіцца хадзіць толькі на танцы. Што зробіш, больш няма куды! Дзяўчаты і хлопцы, збіваючы абцасы, круцяцца літаральна да ўпаду пад духавы аркестр.

Няма пры Доме культуры фотагуртка, гуртка радыёаматараў. Затое ёсць більярд і па-суседству з ім буфет. Ганяюць шары пераважна адны і тыя ж «рыцары більярднага кія», як іх тут называюць. Таго, хто выйграе ў «амерыканку» ці «піраміду» «караюць» у буфеце віном, і пачалося— шум, лаянка, бойка...

Калі моладзь знаходзіць «аддушыну» ў танцах, дык пажылым людзям застаецца толькі кіно. Але ж адзін фільм запар тры разы глядзець не будзеш. І вось сядзяць людзі ў дамах, рэжуцца бясконца ў «падкіднога дурня», «забіваюць казла» ці проста туляюцца без справы па вуліцах, каб хоць як-небудзь прабавіць час.

— Мы на нашых культработнікаў асабліва і не спадзяёмся,—гаворыць жонка настаўніка Лілія Уладзіміраўна Наркевіч. — Забавы прыдумляем самі, ствараем хатнія бібліятэкі, збіраемся ў каго-небудзь на кватэры і слухаем Шаляпіна, Собінава ці Качалава ў грамзапісу. А то вось нядаўна арганізавалі пры кінатэатры пакой маці і дзіцяці. Пенсіянеры гэтую справу на сябе ўзялі.

Усё ж хацелася б, каб у добрым горадзе Вілейцы культура асвятляла кожны куток жыцця, каб людзі забыліся на гульню ў «падкіднога дурня».

ГАРАДСКІ САВЕТ І ГРАМАДСКАСЦЬ

Нядаўна да старшыні гарсавета тав. Котава прыйшла цэлая дэлегацыя.

— Пара пляж зрабіць. Давайце, камандуйце, складайце планы, каштарысы і ўсё, што трэба. А мы самі папрацуем добра!

— Своечасова прыйшлі! — узрадаваўся т. Котаў.—Мне самому гэтая думка не дае спакою. Ды вось ніяк рукі не даходзілі. А цяпер зробім. Возьмемся ўсе дружна і зробім.

Тут жа абмеркавалі, які будзе пляж. Трэба пабудаваць павець ад сонца, два ці тры кіёскі для продажу прахаладжальных напіткаў. На пляжы абавязкова будуць дзяжурыць медработнікі, члены ДАСААФ...

І яшчэ з адной справай трэба ўправіцца як мага хутчэй. У горадзе не хапае дзіцячых пляцовак. Трывожна сябе адчуваюць некаторыя бацькі, пакідаючы сваіх дзяцей пад апекай вуліцы. Але вось пытанне, дзе знайсці месцы для такіх пляцовак? Не за горадам жа! Падумалі і знайшлі выйсце. У некаторых жыхароў Вілейкі прысядзібныя ўчасткі вельмі вялікія— па 15, а то і 20 сотак. Навошта ім такая сядзіба! Вось і знойдзецца месца для дзяцей. Няхай яны сабе там на прасторы гуляюць у лапту, няхай ім там старэйшыя дзеці і бабулі чытаюць кніжкі.

Цяпер у горадзе ідзе будаўніцтва новага дзіцячага сада і ясляў, узводзяцца два 24-кватэрныя дамы з цэнтральным ацяпленнем і некалькі жылых дамоў меншых. Будуецца двухпавярховы ўнівермаг, закладваецца будынак яшчэ адной сярэдняй школы.

Хутка ў горадзе на радасць хатнім гаспадыням будзе працаваць пральня, пачнецца газафікацыя кватэр. Ідзе пракладка гарадскога водапровада і каналізацыі.

Працаваць тав. Котаву лёгка, таму што амаль кожны жыхар горада адчувае сябе паўнамоцным членам гарадскога Савета.

Ул. ВАРНО.

АФАРМЛЕННЕ КНІГІ— НЕ РАМЯСТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

цукерак, у той час, калі зборнік П. Макаля «Вечны агонь» — як супрацьпажарная брашура. Па дваццаць, па трыццаць разоў паўтарае Г. Клікушын адны і тыя ж варыянты свайго «віцебатага» шрыфту на супервокладках і тытулах, якія даўно ўжо муляць вока і чытачам і пісьменнікам. А ў выдавецтве прымірыліся з гэтым.

У Дзяржаўным выдавецтве БССР вельмі не шанцуе афармленню паэтычных зборнікаў. Як Г. Клікушын, так і іншыя мастакі не пранікаюць у творчыя своеасаблівасці таго ці іншага паэта, у яго тэматыку, у яго сістэму вобразаў. Часта паэты скардзяцца: чытаеш мастаку верш, каб падказаць яму вобраз, дэталь, патрэбны штрых, а ён пасля прыносіць нешта зусім далёкае ад стылю, рытму і вобразаў кнігі, якая афармляецца. Таму і атрымліваюцца ў аднаго мастака вокладкі розных кніг падобнымі адна да адной, ды і розныя мастакі часта паўтараюцца. Так, зусім аднолькавыя вокладкі стварыў В. Харэўскі да зборнікаў вершаў С. Грахоўскага і А. Дзеружынскага, хоць гэта вельмі розныя паэты. Адны і тыя ж небаскробы мы бачым нават на суперах кніг П. Панчанкі «Нью-Йоркскія малюнкі» і П. Броўкі «Далёка ад дому», нягледзячы на тое, што афармлялі кнігі розныя па почырку мастакі; першую — М. Шырокаў, другую — М. Гуціеў. Вельмі далёкая ад зместу кнігі вокладка М. Бельскага да зборніка вершаў П. Прыходзькі «Цёплы каравай». Не ўдаліся вокладкі да паэтычных зборнікаў А. Лісічнікаву («Майская просінь» Г. Бураўкіна), Б. Аракчэеву («Узлётная паласа» Ул. Паўлава), П. Калініну («Задуменныя пералескі» А. Лойкі), Е. Лось («Дзявочае сэрца» Д. Бічэль), І. Сталярову («Зялёная прыстань» П. Валкадаева), С. Раманаву («Насцеж» А. Вялюгіна). Прымітыўна афармлены зборнік А. Юдальсона «Прывітанне» (мастак І. Карпіновіч).

Адсутнасць творчага падыходу, глыбокага пранікнення ў змест кнігі можна бачыць і ў афармленні некаторых твораў нашых празаікаў.

У анатацыі да зборніка апавяданняў Л. Прокшы «Крыніца прыгажосці» сцвярджаецца, што творы пісьменніка прысвечаны паказу характара душы савецкага чалавека, а на шмуцтытуле «Апавяданні» намалявана кветачка за калючым дротам. На жаль, аўтар афармлення гэтай кнігі невядомы: выдавецтва нават не палічыла патрэбным паведаміць чытачам прозвішча мастака (мастацкі рэдактар Л. Прагін).

Прынцыповы і дэталёвы аналіз афармлення кніг 1960 г. і тых, якія паспелі ўжо выйсці ў гэтым годзе, паказвае, што творы многіх нашых графікаў выкананы не заўсёды на высокім узроўні. Плённа працуе П. Калінін, аднак побач з яго лепшымі работамі («Верасы на выжарынах» І. Навуменкі, «Данута» А. Карпюка, «Карвіга пакідае хутар» А. Бажко), мы бачым няўдалыя, безгустоўныя, неарыгінальныя («Кедры глядзяць у мора» А. Савіцкага, «Месца ў жыцці» Ул. Шахаўца, «Сосны адшумелі сваё» Ул. Шыціка, «Ты будзеш жыць» П. Тормасава). Часта радуе цікавымі знаходкамі М. Гуціеў (вокладкі да кніг Я. Коласа «Казкі жыцця» і Б. Сачанкі «Дарога ішла праз лес»), і таму вельмі прыкра бачыць яго шэрую, невыразную вокладку да кнігі А. Васілевіч «Падслухала сэрца», зробленую на ўзроўні выданняў дваццатых гадоў. Пасрэдна афарміў здольны мастак І. Немагай нарыс А. Кулакоўскага «Зоркі Салігорскія» і кнігу А. Асіпенкі «Подых кветак і працы». Не ўсё на адным узроўні і ў Ю. Архіпава, які зрабіў такія ўдалыя вокладкі і ўнутранае афармленне да кніг В. Панамарова «На хвалях жыцця», А. Чарнышэвіча «Праз зімы і вёсны» і іншых аўтараў, а цяпер здае слабыя работы, як, напрыклад, вокладку да кнігі Я. Ермаловіча «Над Бярозай». Падобнае знаходзім і ў творчасці многіх іншых мастакоў.

Цяжка ў межах артыкула хаця б бегла ахарактарызаваць афармленне ўсёй мастацкай літаратуры мінулага года і першых месяцаў гэтага. Безумоўна адно: аддзел мастацкага афармлення Дзяржаўнага выдавецтва БССР знізіў патрабавальнасць да мастакоў-графікаў. Вельмі нязначная колькасць назваў кніг абмяркоўваецца на мастацкім савеце; зусім не наладжваецца шырокае абмеркаванне афармлення з удзелам літаратурнай грамадскасці. За выключэннем асобных выпадкаў мастакі не прадстаўляюць папярэдне ў выдавецтва эскізаў, як гэта робіцца ў выдавецтвах Масквы, Ленінграда, Кіева, у выдавецтвах іншых саюзных рэспублік. Як правіла, мастаку ў Дзяржаўным выдавецтве БССР даецца тэрмін, калі ён павінен здаць работу, а тэрмін здачы эскізаў не вызначаецца. І атрымліваецца, што мастак цягне да апошняга дня, пасля прыносіць работу, якую мастацкія рэдактары вымушаны даціягваць да сярэдняга (часам вельмі нізкага) ўзроўню, каб хутчэй здаць у вытворчасць, бо выдавецкі графік не дазваляе адхіліць незавершаную работу. Значная доля віны ляжыць і на рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва, якая не ў тэрмін аддае другія экземпляры рукапісаў на мастацкае афармленне.

Вельмі важная для развіцця кніжнай графікі ў рэспубліцы — праблема кадраў. Абмежаванае кола мастакоў, якія афармляюць беларускую кнігу, нізкі ўзровень афармлення асобных выданняў, — усё гэта павінна выклікаць сур'ёзную трывогу на мастацка-графічным факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Пажадана было б, каб прадстаўнікі Дзяржаўнага выдавецтва БССР, не чакаючы, пакуль прыйдзе папаўненне мастакоў з інстытута, паехалі ў Маскву або іншыя гарады з мэтай прыцягнуць да афармлення беларускай кнігі мастакоў-графікаў братніх рэспублік.

Марудна пераймаецца пакуль што і тое новае, што з'яўляецца ў кнігавыдавецкай практыцы братніх сацыялістычных краін і саюзных рэспублік. Так, не выкарыстоўваюцца як след магчымасці суперокладкі, не заказваюцца спецыяльныя матэрыялы для вокладак (шматколерная вокладачная папера, штапель, палі-хлорвінілавыя вокладкі). У кнігах мінулага года мы чамусьці бачым толькі адзін форзац, спецыяльна зроблены мастаком («Салавей» Зм. Бядулі).

Наяўнасць у Мінску выдатна абсталяванага паліграфічнага камбіната дае магчымасць значна палепшыць мастацкае афармленне кніг. Трэба заўсёды памятаць, што ад вонкавага выгляду выдання залежыць у некаторай ступені і попыт, на яго, а гэта значыць — тыражы.

В. ПЯТРОЎ.

Найдан ВЫЛЧАЎ

З новай кнігі

У гасцях у беларускіх пісьменнікаў знаходзіцца вядомы балгарскі паэт Найдан Вылчаў, які прыехаў у Беларусь, каб пазнаёміцца з нашай літаратурай і культурай, гісторыяй і сучасным жыццём рэспублікі. Ён мае гарачае жаданне вывучыць беларускую мову, каб затым прапагандаваць у Балгарыі лепшыя здабыткі нашай мастацкай літаратуры.

Змяшчаем яго вершы з новай кнігі.

Балада пра партызан

Калі атуліла ноч сцежкі расстайныя,
Калі патанулі ў тумане Балканы,
Калі на дарогах смерць варту расставіла,
Сыходзілі з гор партызаны.
Калі мы шапталіся: — Дзе яны дзеліся?
Ці ёсць у іх хлеб, ці загоены раны? —
У замець і ў буру, дажджом і мяцеліцай
На бітву ішлі партызаны.
Рыпелі фашысцкія вісельні поціху,
Расстрэлы запырскалі крохую паляны,
Але на вяршыні высокага подзвігу
Стаялі насмерць партызаны.
Уночы страчаліся ўпотай з сялянамі,
Бацькі ім у торбы хлеб клалі духмяны,
А самі назаўтра ляглі расстралянымі,
Бо дзеці пайшлі ў партызаны.

Зляў месяц злавесны, вароны кружыліся,
Стаяў над далінай іх крык несціханы,
Але перамогі агні засвяціліся —
Наперад пайшлі партызаны.
І сёння — калі вецер нівы разгортвае,
І пушчы шумяць, і спяваюць Балканы —
Глядзіце: з жывымі героямі
мёртвыя
Ідуць у страі партызаны.

Пра сябе

Мне помніцца: ў маленстве
Вясковым хлапчуком
Хадзіў я ў сіняй шапцы
З бліскучым казырком.

Маленства збегла рэчкай
Пад навіссю лазы
Далёка за пагоркі,
За сінія лясы...

А быў вясны пачатак,
Яснела сінь нябёс,
І шмат перад вачыма
Тварылася дзівос.

Увечар выплывалі
Угору, на прастор
Цяжкія караваны
Маўклівых срэбных зор.

Старыя дрэвы ў садзе
Пускалі цвет за ноч.
Над горным кражам месяц
Блішчаў, як востры нож.

Пах разяды струменіў,
А позірк зноў і зноў
Вяртаўся да буслянак
І белых камінoў...

Мне помніцца: пад вечар —
Гарачыня сплыла —
Мы пасвілі авечак
Паблізу ад сяла.

У косых промнях сонца —
Пад залатым дажджом —
З затоеным дыханнем
Сачылі за хрушчом.

Што, распусціўшы крыльцы,
Здаваўся залатым;
Навыперадкі гуртам
Мы гналіся за ім

І, цэлячыся шапкай,
Задраўшы галаву,
Пад крык і смех вясёлы
Збівалі на траву.

Ах, мая ўцеха — шапка!
Праз майскага жука
Ты засталася, помню,
Зусім без казырка.

Затое верны Шарык
Мне вельмі ўдзячны быў
І хрумстаў пачастунак,
Які ён так любіў!..

Цяпер другі ўжо вечар
Прыходзіць да мяне.
Замоўклі. адзвінелі
Званочкі ў табуне.

І, развінуўшы крылы,
У промнях зары,
Ляцяць мае ўспаміны
Аб колішняй пары.

І я — услед за імі,
Нястрымна, як і перш,
Задыханы, імчуся,
Каб іх злавіць у верш.

Пераклаў з балгарскай мовы
Ніл ГІЛЕВІЧ.

Наступны нумар газеты «Літаратура і мастацтва» выйдзе 30 красавіка г. г.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ!

НОВЫЯ РАМАНЫ, АПОВЕСЦІ, АПАВЯДАННІ, ПАЭМЫ І ВЕРШЫ, УСПАМІНЫ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ПАЭТАЎ, а таксама іншыя матэрыялы, прысвечаныя шматграннаму жыццю нашай рэспублікі, рэгулярна друкуюць на сваіх старонках літаратурна-мастацкія часопісы **«БЕЛАРУСЬ», «НЕМАН», «ПОЛЫМЯ», «МАЛАДОСЦЬ».**

КУПЛЯЙЦЕ гэтыя **ВЫДАННІ**, яны заўсёды ёсць у продажы ў магазінах і кіёсках «Саюздруку».

«САЮЗДРУК».
Міністэрства сувязі БССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 00185

Друкарня імя Сталіна.